Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

12 ВЕРАСНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 176 (30056)

ЯК АДГУКНУЛІСЯ ЛІТАРАТАРЫ НА 17 ВЕРАСНЯ 1939-ГА 8

МЫ ВЫБІРАЕМ ВІНАГРАД 13

КАРОТКА

• Знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг Беларусі ў студзені — ліпені вырас на 13,4 працэнта да $53,8 млрд.

• ДПК: больш за 321 тыс. іншаземцаў з пачатку года наведалі Беларусь па бязвізе.

• Забароны на наведванне лясоў дзейнічаюць у 14 раёнах Магілёўскай і Гомельскай абласцей Беларусі.

• Белкаапсаюз заключыў амаль 300 дагавораў з фермерскімі гаспадаркамі на закупку 10 тыс. тон прадукцыі.

• КДБ затрымаў у Беларусі тры баявыя ячэйкі, якія працавалі на Службу бяспекі Украіны.

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксей БАГДАНАЎ, міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю:

«Мы, беларусы, заўсёды адрозніваліся здольнасцю аб'ядноўвацца ў цяжкія часы. Вопыт мінулых пакаленняў наглядна паказвае, што толькі ў адзінстве сіла беларускага народа. І цяпер, знаходзячыся ў складанай геапалітычнай і эканамічнай абстаноўцы, мы разумеем, што толькі разам можам справіцца з любымі выклікамі сучаснасці. Няхай надыходзячы Дзень народнага адзінства прадэманструе ўсяму свету сапраўдную сілу адзінства нашых людзей, народа Беларусі».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Беларусі і Турцыі ўдалося нямала зрабіць па паглыбленні ўзаемаадносін, але ёсць і нявырашаныя пытанні»

Новы працоўны тыдзень Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі пачаўся з міжнароднай тэматыкі. У Палацы Незалежнасці кіраўнік дзяржавы сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Турэцкай Рэспублікі ў Беларусі Мустафой Азджанам.



Фота БелТА.

Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, за апошні час удалося нямала зрабіць у паглыбленні адносін Беларусі і Турцыі, але застаецца і шэраг нявырашаных пытанняў у сувязі з дамоўленасцю з Рэджэпам Таіпам Эрдаганам. Аднак, па словах беларускага лідара, гэта пытанні вырашальныя.

«У нас падобныя пазіцыі па многіх праблемах міжнародных адносін, у тым ліку і па крызіснай сітуацыі ва Украіне, мы неаднойчы пра гэта казалі. Турцыя і Беларусь выступаюць з пазіцыі дыпламатычнага вырашэння гэтага канфлікту», — адзначыў беларускі лідар.

Што датычыцца гандлёва-эканамічных адносін, то кіраўнік дзяржавы нагадаў, што бакі дамаўляліся аб дасягненні паўтарамільярднага тавараабароту. «Нам трэба выходзіць на гэты ўзровень, тым больш магчымасці такія ёсць. У нас вялікая цікавасць да вашай суверэннай, незалежнай палітыкі. Вы вырашаеце пытанні так, як трэба турэцкаму народу. І ў гэтым, вядома, ваш прэзідэнт перасягнуў усякія чаканні турэцкага народа. Мы гатовы рабіць усё для таго, каб ваша краіна развівалася. Але трэба здымаць нявырашаныя пытанні, якія ў нас існуюць, і мы вельмі спадзяёмся, што ў гэтай няпростай сітуацыі Турцыя паддаставіць нам плячо», — сказаў беларускі лідар. Ён адзначыў, што хацеў бы абмеркаваць з паслом Турэцкай Рэспублікі шэраг пытанняў, якія трэба вырашыць хуткім часам.

СТАР. 2

Дажынкі

З ХЛЕБАМ І ПЕСНЯЙ

Брэстчына першай у краіне правяла абласны фестываль працаўнікоў вёскі. Святкавалі ў Ганцавічах

Чым вызначаліся сёлетнія «Дажынкі», чым адрозніваліся ад папярэдніх, якія некалькі гадоў запар праходзілі ў пасёлках — былых райцэнтрах вобласці? Відаць, разнастайнасцю музыкі, танцаў, усмешак, парадам сельгастэхнікі, якая ўдзельнічала ва ўборцы, кветкавых кампазіцый і вырабаў з саломы, недалёкіх ад сапраўдных твораў мастацтва. Маляўнічыя снапы і дажыначныя вянкі зрабілі асобныя жыхары райцэнтра і ўпрыгожылі імі ўласныя дварыя. А яшчэ прыцягвалі ўвагу прыгожыя караваі на многіх лакацыях як галоўны сімвал свята.

Фота БелТА.

СТАР. 4

Адукацыя

ПЛЯЦОЎКА ПЕДАГАГІЧНАГА МАЙСТЭРСТВА НАЦЫЯНАЛЬНАГА МАШТАБУ

Фінал рэспубліканскага конкурсу «Настаўнік года» — не толькі прафесійныя спаборніцтвы...

Уладзімір Здановіч, Валянціна Гінчук, Вадзім Шпетны, Ігар Якіменка, Ірына Клявец, Юрый Андрэйчык, Інэса Зубрыліна, Віктар Жук, Святлана Румянцава, Вадзім Лосеў... Усяго праз некалькі тыдняў на небасхіле педагагічнага майстэрства запаліцца новая зорка, дакладней, зорак будзе шмат, але абсалютным пераможцам абвесцяць толькі аднаго настаўніка.

Пад патранажам Акадэміі паслядыпломнай адукацыі 17 верасня стартуе заключны этап Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагогаў «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь». Пра тое, якія выпрабаванні чакаюць канкурсантаў у фінале і суперфінале конкурсу, і чаканні ад свята прафесійнага майстэрства мы гутарым з рэктарам акадэміі, кандыдатам філасофскіх навук, членам Савета Рэспублікі Алегам ДЗЯЧЭНКАМ.

СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

Афіцыйна

УПЭЎНЕНАЯ ПЕРАМОГА

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Уладзіміра Пуціна з паспяховым правядзеннем у Расіі адзінага дня галасавання

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна з паспяховым правядзеннем важнай для ўнутрыпалітычнага жыцця Расіі падзеі — адзінага дня галасавання. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Упэўненая перамога прадстаўнікоў Усерасійскай палітычнай партыі «Адзіная Расія» на выбарах кіраўнікоў суб'ектаў, дэпутатаў заканадаўчых і мясцовых прадстаўнічых органаў дзяржаўнай улады сведчыць пра шырокую падтрымку курсу на суверэннае развіццё краіны і кансалідацыю грамадства, — падкрэсліў беларускі лідар. — Перакананы, народныя выбраннікі ўнясуць важкі ўклад у справу ўмацавання міжрэгіянальнага супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь, будуць садзейнічаць рэалізацыі маштабных планаў па нарошчванні стратэгічнага партнёрства паміж Мінскам і Масквой».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Уладзіміру Пуціну добрага здароўя, дабрабыту і ўвасаблення ў жыццё ўсяго задуманага.

«Беларусі і Турцыі ўдалося нямала зрабіць па паглыбленні ўзаемаадносін, але ёсць і нявырашаныя пытанні»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У сваю чаргу Мустафа Азджан перадаў Аляксандру Лукашэнку прывітанне ад яго турэцкага калегі Рэджэпа Таіпа Эрдагана. Пасол таксама падзякаваў за дапамогу ў ліквідацыі наступстваў землетрасення ў Турцыі. «Мы былі ўражаныя салідарнасцю беларускага народа, і мы ніколі не забудзем дапамогу, якую нам аказалі беларускія сябры», — сказаў ён. У лютым гэтага года паўднёва-ўсходнія рэгіёны Турцыі пацярпелі ад разбуральнага землетрасення. Па даручэнні Прэзідэнта Беларусі для садзейнічання ў правядзенні пошукава-ратавальных работ у Турцыю накіроўвалася каманда рэспубліканскага спецатрада МНС «Зубр», а таксама была аказана гуманітарная дапамога.

У тэму

«Магчыма дасягнуць тавараабароту ў 1,5 мільярда долараў»

У 2019 годзе прэзідэнты Беларусі і Турцыі дамовіліся аб паступовым давядзенні аб'ёму двухбаковага тавараабароту да 1,5 мільярда долараў. У мінулым годзе ўзаемны гандаль таварамі дасягнуў 1,04 мільярда долараў, паслугамі — амаль 107 мільёнаў долараў. У студзені — ліпені 2023-га тавараабарот склаў 674,9 мільёна долараў.

У размове з журналістамі Мустафа Азджан адзначыў, што дасягнуць тавараабароту ў паўтара мільярда долараў магчыма. «Тым не менш мы павінны разумець, што існуюць знешнія фактары, якія не дазваляюць нам працаваць у гэтым кірунку дастаткова хутка. Але мы гатовы працаваць разам, каб знайсці ўзаемапрымальныя варыянты. Беларусь для Турцыі — вельмі добры партнёр, сяброўская краіна. Нас звязваюць шматгадовая вера адзін у аднаго, узаемапавага, і я б хацеў падкрэсліць, што паміж нашымі краінамі не існуе праблем, існуюць пэўныя пытанні, якія мы мамем намер вырашаць разам з нашымі беларускімі партнёрамі і калегамі», — сказаў ён. У якасці пазітыўнага прыкладу пасол прывёў прыклад развіцця двухбаковых адносін у галіне культуры. У найбліжэйшы час у Мінску адкрыецца турэцка-беларускі навуковы цэнтр пры падтрымцы Нацыянальнай акадэміі навук. Гэты цэнтр будзе ўмацоўваць узаемаадносіны паміж нашымі краінамі ў галіне культуры і навукі», — расказаў Мустафа Азджан.

Валерыя СЦЯЦКО.

Прыярытэты

ЗАХАВАЦЬ І ПРЫМНОЖЫЦЬ

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка — пра гістарычныя паралелі і сучасны кантэкст Дня народнага адзінства

Як згадаў Старшыня Палаты прадстаўнікоў, 17 верасня 1939 года пачаўся вызваленчы паход Чырвонай Арміі, у выніку якога былі аб'яднаныя ўсходняя і заходняя часткі Беларусі, а наш народ стаў адзіным цэлым. У сучаснай Беларусі гэта святочная дата — Дзень народнага адзінства.

Фота БелТА.

— Аб значнасці тых далёкіх падзей дагэтуль спрачаюцца гісторыкі і палітолагі, аднак непарушнае адно: беларусы сталі адзіным народам, які валодае ўласнай зямлёй і перспектывай развіцця, — лічыць Уладзімір Андрэйчанка. — Завяршыўся працяглы перыяд, калі лёс нацыі вырашалі іншыя, а росчыркам пяра на Рыжскім дагаворы 1921 года палова краіны стала польскай калоніяй.

Сёння робяцца спробы абвергнуць дадзены тэзіс і падаць падзеі 1920—1930-х гадоў як карысць. На гэта працуюць гісторыка-прапагандысцкія структуры заходніх дзяржаў, а найбольшую актыўнасць праяўляе наша найбліжэйшая суседка Польшча.

Звернемся да фактаў. За дзесяць гадоў з 1921-га да 1931 года на тэрыторыях, акупаваных Польшчай, колькасць беларусаў скарацілася амаль на мільён. Да 1934 года з чатырохсот беларускіх школ, якія існавалі да гвалтоўнага падзелу, засталося 16, а ў 1939-м — ніводнай. Курс на «этнічнае адзінства» стаў асновай польскай палітыкі ў Заходняй Беларусі, пра што не саромеючыся заяўлялі прадстаўнікі ўлады.

Міністр асветы Польшчы С. Грабскі казаў, што «мяжа палітычная павінна стаць мяжой этнічнай», а міністр унутраных спраў Л. Скульскі запэўніваў, што «праз дзесяць гадоў у Польшчы нават са свечкай будзе немагчыма знайсці беларусаў». Вось і ўся размова аб нацыянальным самавызначэнні і дэмакратычным выбары.

З уласцівымі беларусам тактам і педантычнасцю мы на працягу дзесяцігоддзяў сціпла замоўчвалі інфармацыю аб працэсах і падзеях, якія адбываліся на нашай тэрыторыі ў першай палове XX стагоддзя. Вырасла не адно пакаленне грамадзян, якое не ведала пра пасадніцтва і паланізацыю, этнічную дыскрымінацыю і рэлігійны прыгнёт. Беларусь выбудоўвала адносіны з суседзямі на прынцыпах раўнапраўя, законнасці і добрасуседства. Наш Прэзідэнт неаднаразова публічна заяўляў, што «суседзі — яны ад бога і з імі трэба жыць у міры і згодзе».

У гэты ж час Варшава мэтанакіравана праводзіла палітыку «ціхай экспансіі», уводзіла картку паляка, гераізавала ўдзельнікаў бандыцкага падполля, дэманізавала вышэйшае палітычнае кіраўніцтва Беларусі, перапісвала гісторыю і будавала планы па вяртанні «Усходніх крэсаў».

Сёння беларусам прыходзіцца ў чарговы раз адстойваць сваё права на незалежнасць, абараняць суверэнітэт, уласныя каштоўнасці і абраны шлях развіцця. Ва ўмовах, калі ў свеце расце нестабільнасць, разбураюцца асновы, актыўна пераглядаюцца дамоўленасці, менавіта адзінства нацыі выступае той скрэпай, якая аб'ядноўвае беларускі народ.

Невыпадкова ў Беларусі адроджана свята — Дзень народнага адзінства. Гэта вынік глыбокага асэнсавання гістарычных падзей і рэальны адказ на сучасныя палітычныя працэсы.

Ва ўмовах, калі разгарнулася бітва за свядомасць людзей, менавіта гістарычная праўда становіцца самай эфектыўнай зброяй для перамогі. Час на ўвесь голас заявіць і даходліва растлумачыць усім, што калі б не падзеі верасня 1939-га, то сёння не было б суверэннай Беларусі.

Для нацыі існавала рэальная пагроза ператварэння ў знікаючую этнічную меншасць, пазбаўленай нацыянальнай эліты, магчымасці нацыянальна-культурнага развіцця і тым больш нацыянальна-дзяржаўных перспектыў.

Беларускі народ выпакутаваў і заваяваў права на незалежнасць. У канцы XX стагоддзя быў рэалізаваны гістарычны шанц на ўласную дзяржаўнасць, а найважнейшы крок да яе, які аб'яднаў дзве часткі сілком падзеленага народа, быў зроблены ў верасні 1939 года.

Быць гаспадарамі на ўласнай зямлі, захоўваць нацыянальную самабытнасць і забяспечваць дастойнае жыццё грамадства — у гэтым сутнасць Дня народнага адзінства, — падкрэсліў Уладзімір Андрэйчанка. — Мы аддаём даніну памяці пакаленням беларусаў, якія захавалі і абаранілі нацыянальную самабытнасць, ганарымся сучаснымі дасягненнямі, фарміруем асновы далейшага развіцця, прымнажаем народны здабытак, шчыра жадаючы Радзіме і ўсім суайчыннікам міру, дабрабыту і росквіту.

Памяць

У ГОНАР ПОДЗВІГУ

У Бешанковіцкім раёне Віцебскай вобласці пасля рэканструкцыі адкрылі мемарыяльны комплекс на месцы злучэння войскаў 39-й арміі 3-га Беларускага фронту і 43-й арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту.

Сёння паблізу вёскі Гняздзілава, што ў Бешанковіцкім раёне, ціха. Напамінам аб далёкіх ваенных дзеяннях для нашага пакалення з'яўляецца велічны мемарыял з гранітнымі стэламі, што імкнуцца ўверх. А вось у чэрвені 1944-га года тут ішлі крывапралітныя баі: перадавыя падраздзяленні 1124-га стралковага палка 334-й стралковай дывізіі 43-й арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту фарсіравалі Заходнюю Дзвіну і злучыліся з 61-м гвардзейскім стралковым палком 19-й гвардзейскай стралковай дывізіі 39-й арміі 3-га Беларускага фронту. У выніку наступных трохдзённых баёў былі поўнасцю знішчаны пяць нямецкіх дывізій, больш за дзесяць тысяч гітлераўскіх салдат і афіцэраў узята ў палон.

У 1966 годзе на 235-м кіламетры па трасе М-3 Мінск — Віцебск была ўзведзена жалезабетонная стэла вышынёй 4,5 метра з замацаванай на ёй мемарыяльнай дошкай. З 2021 да 2023 года аўтарскі калектыў у складзе скульптара Аляксандра Гвоздзікава і архітэктараў Аляксандра Міхайлюкова і Глеба Арлоўскага працаваў над рэканструкцыяй помніка, які цяпер складае цэлы мемарыяльны комплекс, дзе злучыліся падзеі 1941—1944 гадоў. Два штыкі, якія імкнуцца ўверх, сімвалізуюць дзве злучаныя арміі, ордэн Айчыннай вайны — разгром ворага. На падножжы стэлы знаходзіцца п'едэстал з вянком, які сімвалізуе подзвіг савецкіх воінаў. У склад комплексу ўваходзіць самаходная артылерыйская ўстаноўка СУ-100 перыяду Другой сусветнай вайны.

— Адкрыццё помніка прайшло напярэдадні аднаго з самых ганаровых свят вайсковай славы — Дня танкіста. Танкавыя войскі ўнеслі значны ўклад у разгром фашызму. На пастаменце ўстаноўлена самаходная артылерыйская ўстаноўка СУ-100, якая будзе служыць напамінам аб подзвігу пераможцаў, аб тых, хто тут, на віцебскай зямлі, у 1941 годзе стрымліваў націск праціўніка, хто граміў ворага ў ходзе Віцебска-Аршанскай наступальнай аперацыі 1944 года, аб героях Супраціўлення, партызанах-падпольшчыках, аб усіх, хто выкоўваў Вялікую Перамогу, — адзначыў міністр абароны Віктар Хрэнін.

— Сімвалічна, што адкрыццё памятнага знака, які будзе нагадваць сённяшнім і будучым пакаленням аб найважнейшай падзеі ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, праходзіць напярэдадні Дня народнага адзінства ў Год міру і стваральнай працы. Наш святы абавязак — памятаць пра ўрокі вайны, актыўна супрацьдзейнічаць забыццю. Мы, беларусы, захоўваем і працягваем створанае папярэднімі пакаленнямі, умацоўваючы канкрэтнымі справамі родную краіну. Галоўныя ўрокі нашай агульнай Перамогі — урокі згуртаванасці і яднання народаў у супрацьстаянні гвалту і прыгнёту. З кожным годам расце ўвага да захавання нацыянальнай спадчыны, да людзей, якія ўслаўлялі і ўслаўляюць нашу зямлю гераічным подзвігам і самаадданай працай. Помнік на значным гістарычным месцы — яшчэ адно пацвярджэнне гэтаму. Яго адкрыццё будзе садзейнічаць грамадзянскаму станаўленню і патрыятычнаму выхаванню моладзі, — падкрэсліў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін.

Фота БелТА.

Сродкі на рэканструкцыю помніка былі сабраныя ў ходзе правядзення раённай акцыі «Вахта Памяці», да якой далучыліся не толькі жыхары раёна, але і расіяне. Старшыня Бешанковіцкага райвыканкама Галіна Унуковіч уручыла падзякі спонсарам і звярнулася да ўсіх хто паўдзельнічаў у рэканструкцыі.

У гонар подзвігу герояў-вызваліцеляў прагучалі залпы воінскага салюту, удзячныя нашчадкі ўсклалі кветкі да падножжа мемарыяльнага комплексу.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

Акцыя

ПАД СЦЯГАМІ АДЗІНСТВА

Пасля Гродна Віцебск сустрэў удзельнікаў рэспубліканскага аўтапрабегу «Сімвал адзінства — 2023», які праходзіць пад эгідай рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Патрыёты Беларусі».

Фота «Витебские вести».

Адпраўным пунктам святочнага дня ў горадзе над Дзвіной стаў мемарыяльны комплекс «5-ы полк», дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны размяшчаўся адзін з найбуйнейшых канцлагераў Беларусі. Удзельнікі рэспубліканскай акцыі ўшанавалі памяць загінулых хвілінай маўчання і ўсклалі кветкі да абеліска.

Галоўныя ўрачыстасці прайшлі ў цэнтры горада, на пляцоўцы культурна-спартыўнага комплексу Летняга амфітэатра. Напярэдадні 17 верасня тут з'явілася абласная алея Адзінства са сцягоў раёнаў паўночнага рэгіёна, яе наведвальнікі змогуць не толькі азнаёміцца з сімваламі любога раёна, але і даведацца аб яго славутасцях і дасягненнях, перайшоўшы па QR-кодзе.

— Алея Адзінства ў Віцебску дасць старт адкрыццю аднайменнай алеі ў горадзе Мінску, дзе будуць сабраны сцягі раёнаў з усёй краіны, — адзначыў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Субоцін. — Для гэтага Віцебшчына першай перадае ў Мінск сцягі кожнага раёна нашай вобласці. Галоўная мэта рэспубліканскай акцыі — кансалідаваць грамадства ў адзінай ідэі міру і стваральнай працы пад сімваламі рэгіёнаў. Акцыя праходзіць напярэдадні Дня народнага адзінства, гэта свята падкрэслівае пераемнасць пакаленняў і дачыненне ўсіх беларусаў да лёсу Радзімы. Кожны жыхар нашай краіны незалежна ад нацыянальнасці з гонарам называе сябе грамадзянінам Беларусі, для ўсіх, хто тут жыве і хто сюды прыехаў, наша шчодрая зямля стала родным домам. Няхай Дзень народнага адзінства напоўніць гонарам за нашу краіну і жаданнем ствараць на яе карысць.

Кіраўнікі райвыканкамаў паўночнага рэгіёна перадалі свае сцягі старшыні РГА «Патрыёты Беларусі» Мікалаю Зарубіцкаму. Ен падкрэсліў, што кожны год рэспубліканская акцыя праходзіць маштабна і прыгожа. «Для мяне вялікі гонар, што ў ёй актыўна прымаюць удзел прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў, моладзь. Кожны раз мы стараемся дадаць у акцыю разыначку. Наша мэта сёлета — аб'яднаць беларусаў пад адным з нашых галоўных нацыянальных сімвалаў — сцягам. Віцебшчына стала чацвёртай вобласцю, якую мы наведалі, — пабывалі ўжо ў Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай. Мая родная віцебская зямля сустрэла нас цёпла. Рэгіён стаў першым, дзе стварылі абласную алею раённых сцягоў. Аўтапрабегі, ініцыяваныя грамадскім аб'яднаннем, карыстаюцца вялікай цікавасцю і сталі свайго роду класікай. Вядома, яны не павінны быць адзінымі ў ліку мерапрыемстваў нашага аб'яднання, таму стараемся праводзіць іншыя, ажыццяўляць новыя праекты для яднання краіны. Алея сцягоў усіх раёнаў Беларусі будзе размяшчацца ў Мінску. Перад кожным з іх будзе знаходзіцца шыльда з QR-кодам, з дапамогай якога можна будзе даведацца пра гісторыю раёна і пазнаёміцца з выбітнымі людзьмі».

Штогод аўтапрабег праходзіць праз усе 118 раёнаў краіны. Летась яго ўдзельнікі збіралі шасцярэнькі, каб паказаць, што наша грамадства — адзіны механізм, а сёлета аўтацягнік збірае сцягі для алеі ў сталіцы нашай краіны.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.

Добрая навіна

ВЫСОКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ УЗНАГАРОДАЙ АДЗНАЧАНЫ ПРАФЕСАР ІВАН ЧАРОТА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка адзначыў дзяржаўнымі ўзнагародамі вялікую групу працаўнікоў краіны. Сярод узнагароджаных медалём Францыска Скарыны — вядомы ў Беларусі даследчык беларуска-сербскіх літаратурных і гуманітарных сувязяў прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Іван Чарота.

Нараджэннем з вёскі Лышчыкі Кобрынскага раёна, што на Берасцейшчыне, славіст, перакладчык, літаратуразнавец, публіцыст, акадэмік Сербскай акадэміі навук і мастацтваў, чалавек, які ў сваім жыцці здзейсніў нямала творчых адкрыццяў, на працягу многіх гадоў з'яўляецца старшынёй секцыі мастацкага перакладу Саюза пісьменнікаў Беларусі, Іван Аляксеевіч Чарота зрабіў неймаверна шмат для развіцця сербістыкі ў Беларусі. Вучоны і пісьменнік — часты госць у дружалюбнай да Беларусі Сербіі.

Прафесар пераклаў на беларускую мову многія творы з сербскай, славенскай, македонскай, харвацкай, іншых славянскіх моў. Аўтар каля 800 навуковых публікацый, Іван Аляксеевіч Чарота друкуецца ў Беларусі, Расіі, Сербіі, іншых славянскіх краінах. Навуковы кансультант многіх эцыклапедычных выданняў, ён уваходзіць у склад рэдакцыйных калегій больш чым дзесяці перыядычных выданняў. Прафесарам Чаротам здзейснены пераклады звыш 1400 твораў пісьменнікаў Сербіі на беларускую і рускую мову. Многія пераклады Івана Аляксеевіча змешчаны ў штогадовым альманаху «Далягляды».

Сярод узнагарод перакладчыка і літаратуразнаўцы — Прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», Міжнародная прэмія імя Ф. М. Дастаеўскага (Сербія), Міжнародная прэмія Карычаў (Сербія), ордэн Свяціцеля Кірылы Тураўскага (Беларуская праваслаўная царква) і многія іншыя.

Саюз пісьменнікаў Беларусі вінша свайго калегу з высокай дзяржаўнай адзнакай!

Максім ПЯСЧАНСКІ.

Надвор'е

Прыпячэ да плюс 31

Як і прадказвалі айчынныя сіноптыкі, першая дэкада верасня па тэмпературным рэжыме апынулася ў асноўным на 1—3 градусы вышэй за кліматычную норму. Толькі ў асобных раёнах Віцебскай і Магілёўскай абласцей тэмпература паветра была ў межах сярэдніх шматгадовых значэнняў. Пры гэтым, паводле папярэдніх ацэнак, цёплай будзе і другая дэкада верасня. Так, у першай палове гэтага тыдня ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны працягне вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, пры гэтым у паўднёва-заходніх раёнах адаб'ецца ўплыў цёплай паветранай масы міжземнаморскага паходжання. Істотных ападкаў па краіне не чакаецца, а тэмпература паветра ў асноўным будзе каля на 1—4 градусы вышэй за кліматычную норму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.

Даволі кантраснае надвор'е будзе ў аўторак. У гэты дзень чакаецца пераважна без ападкаў. Раніцай у некаторых раёнах слабы туман і досыць холадна: месцамі па ўсходзе краіны 3—5 градусаў. Днём тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 23 градусаў па паўночным усходзе да плюс 29 градусаў па паўднёвым захадзе краіны.

Практычна без ападкаў і ў сераду. Уначы і раніцай у некаторых раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад 7 градусаў па ўсходзе да плюс 17 градусаў па захадзе краіны. Днём паветра прагрэецца да 22—28 градусаў, а ў паўднёва-заходніх раёнах — да 31 цяпла.

У чацвер нас чакаюць грыбныя ападкі, таму што ўначы будзе максімальная вільготнасць. У цёмны час сутак пераважна па заходняй палове краіны, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі пройдуць кароткачасовыя дажджы. У некаторых раёнах навальніцы, удзень моцныя дажджы і ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе ад 7 градусаў на ўсходзе да плюс 17 градусаў на захадзе краіны. Днём слупкі тэрмометраў пакажуць 17—24 градусы, а ў паўднёва-ўсходніх раёнах — да 28 градусаў цяпла.

Паводле папярэдняга прагнозу сіноптыкаў, у канцы тыдня фон атмасфернага ціску зноў пачне павышацца і ападкаў будзе няшмат. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі па краіне магчымы непрацяглыя туманы.

У пятніцу ноччу і раніцай месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Удзень будзе пераважна без ападкаў. Уначы прагназуецца ад 8 градусаў па паўночным захадзе да плюс 16 градусаў па паўднёвым усходзе. Днём тэмпература павысіцца да 17—24 градусаў, а ў паўднёва-ўсходніх раёнах — да плюс 26 градусаў.

У суботу чакаецца пераважна без ападкаў. У начныя і ранішнія гадзіны ў некаторых раёнах слабы туман. Уначы чакаецца 5—11 градусаў, а месцамі — да плюс 14 градусаў. Максімальная тэмпература днём складзе 19—26 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Колькасць загінулых пры землетрасенні ў Марока павялічылася амаль да 2,5 тысячы чалавек

Яшчэ не менш за 2,5 тысячы чалавек атрымалі раненні, паведаміла Reuters. Паводле даных агенцтва, землетрасенне магнітудай 6,8 адбылося позна ўвечары 8 верасня за 72 кіламетры на паўднёвы-захад ад Маракеша і стала самым разбуральным у краіне з 1960 года. Маштабы шкоды пакуль не вызначаны.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў спачуванне каралю Марока Махамеду VI у сувязі са шматлікімі чалавечымі ахвярамі і маштабнымі разбурэннямі ў выніку землетрасення. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «У Рэспубліцы Беларусь з глыбокім жалем і болем у сэрцы ўспрынялі сумную вестку пра жудаснае землетрасенне ў вашай краіне, якое прывяло да шматлікіх чалавечых ахвяр і маштабных разбурэнняў», — гаворыцца ў спачуванні.

У М'янме адзначылі этнічную напружанасць у краіне з-за каланіяльнай палітыкі Брытаніі

Каланіяльная палітыка Вялікабрытаніі прывяла да з'яўлення этнічнай напружанасці і сацыяльнай няроўнасці ў М'янме, а таксама да жабрацтва насельніцтва краіны. Пра гэта заявіў міністр прамысловасці М'янмы Чарлі Тан падчас выступлення на Усходнім эканамічным форуме, які праходзіць ва Уладзівастоку, паведаміла ТАСС. «Больш за сто гадоў М'янма знаходзілася пад уладай Вялікабрытаніі — да абвяшчэння незалежнасці ў 1948 годзе. Брытанцы стварылі цэнтралізаваную адміністрацыю, якая падарвала традыцыйную мадэль кіравання, што прывяло да з'яўлення этнічнай напружанасці, якая існуе і да сёння», — адзначыў міністр. Паводле яго слоў, брытанцы актыўна эксплуатавалі прыродныя рэсурсы краіны, вывозілі мінеральную сыравіну, што «прывяло да сацыяльнай няроўнасці і жабрацтва многіх грамадзян М'янмы». «Брытанцы навязвалі свае традыцыі, мову, што прывяло да эрозіі традыцыйнай культуры ў М'янме», — адзначыў міністр.

Маск лічыць, што прэзідэнтам ЗША з'яўляецца той, хто кіруе тэлесуфлёрам Байдэна

Сапраўдным прэзідэнтам ЗША з'яўляецца не Джо Байдэн, а той, хто кіруе яго тэлесуфлёром. Такое меркаванне выказаў Ілан Маск, паведаміла ТАСС. Такім чынам ён пракаментаваў жартоўную публікацыю сатырычнага партала The Babylon Bee. У ёй гаворыцца, быццам бы некалькі заканадаўцаў-рэспубліканцаў заклікалі сысці ў адстаўку спецыяліста, які «кожны дзень кажа Байдэну, што рабіць». Прэзідэнту ЗША летась споўнілася 80 гадоў. Ён нярэдка дапускае ў сваіх публічных выступах розныя агаворкі і славесныя ляпы. Так, у ліпені мінулага года Байдэн прачытаў з тэлесуфлёра тэхнічныя падказкі разам з асноўным тэкстам выступу. А нядаўна ён не здолеў карэктна вымавіць імя наследнага прынца Саудаўскай Аравіі Мухамеда ібн Салмана Аль Сауда падчас выступлення на саміце G20 у Дэлі. Пры гэтым спроба выправіць сітуацыю прывяла да яшчэ большага канфузу. Рэспубліканцы выкарыстоўваюць кур'ёзныя сітуацыі ў міжпартыйнай барацьбе, каб паставіць пад сумнеў разумовыя і фізічныя здольнасці кіраўніка дзяржавы працягваць кіраваць Злучанымі Штатамі.

З ХЛЕБАМ І ПЕСНЯЙ

Стракатая дажыначная планета

Ганцаўчане ўмеюць прывеціць гасцей! Дэлегацыю кожнага раёна сустракалі караваем, бадзёрай музыкай, добрымі словамі, што адразу настройвала на свята. Людзі ішлі ў цэнтр горада арганізавана і паасобку, сем'ямі, невялікімі групамі. Зранку наваколле было расквечана стракатымі фарбамі кірмашу, мноствам прыбраных людзей, усмешкамі гасцей, якія сустракалі тут сяброў і знаёмых.

Па ўсім відаць, што самадзейныя артысты старанна рыхтаваліся да фестывалю. Праграму выступлення юных артыстаў назвалі «Дзеці на дажыначнай планеце». Сказаць, што канцэрт калектываў Ганцавіцкай дзіцячай школы мастацтваў сабраў шмат гледачоў і праходзіў з вялікім поспехам — амаль нічога не сказаць. Выступленне маленькіх артыстаў узнімала настрой, заражала пазітывам. Юныя танцоры, скрыпачы, салісты паказалі сябе як сапраўдныя майстры сцэны.

— Яны рыхтаваліся, разам з намі хваляваліся, нам хацелася як мага лепш паказаць сябе і падарыць добры настрой гледачам, — сказала **дырэктар школы мастацтваў Вольга КУПРЫЯНІК.** — Нашаму ўзорнаму ансамблю народных духавых інструментаў «Дударыкі» выпаў гонар разам з дарослымі артыстамі адкрываць канцэртную праграму «Дажынак». Неаднаразовыя лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў іграліі «Пралог». Гэта вялікая адказнасць, юныя артысты пад кіраўніцтвам свайго педагога Любові Занькі надзвычай старанна рыхтаваліся, і ўсё ў іх атрымалася. Ансамбль скрыпачоў «Срэбныя струны» хораша паказаў сябе, узорны танцавальны калектыў таксама. Сваім выступленнем нашы выхаванцы сапраўды стварылі адмысловую «дажыначную планету». Мы хацелі падкрэсліць, як шануем свята хлебаробаў, як паважаем працу людзей, што вырошчваюць хлеб.

Зробленае застанецца

З самага ранку разгарнуў свае шатры па вуліцы 17 Верасня горад майстроў. Тут зладзілі не толькі гандаль, але і выставу. Народныя ўмельцы з задавальненнем расказвалі пра вырабы, праводзілі майстар-класы для ахвотных. На гэтай пляцоўцы яе аўтары-арганізатары пастараліся паказаць адметнасць Ганцаўскага краю, найперш прадставіць рамёствы свайго раёна: вышыванкі, ткацтва, ганчарныя вырабы, і ім, як выглядае, гэта ўдалося. Былі майстры і з іншых раёнаў, словам, ніхто не застаўся без сувеніра на памяць.

Горад майстроў, несумненна, парадаваў. А яго прадукцыя арганічна ўпісалася ў абноўленае аблічча Ганцавіч. Райцэнтр прыкметна папрыгажэў і памаладзеў. Вонкавыя перамены адчуваюцца літаральна ва ўсім. Падрыхтоўка вялася амаль год, і зроблена вельмі шмат. Абноўлена ў тым ліку інфраструктура: вуліцы і тратуары, інжынерныя камунікацыі — усё, што зрабіла райцэнтр больш сучасным, прыгожым, утульным. Капітальны рамонт праведзены амаль на дзевяці кіламетрах вуліц. З'явілася новае асвятленне. На трох асноўных транспартных артэрыях горада пракладзена ліўневая каналізацыя. Установлены новыя сучасныя прыпыначныя павільёны. Капітальна адрамантавана некалькі жылых дамоў, іншыя зведалі бягучы рамонт.

Фота БелТА.

Многае зроблена для паляпшэння аб'ектаў сацыяльнай сферы. Адрамантаваны і мадэрнізаваны гарадскі Дом культуры, дзіцячая школа мастацтваў, сярэдняя школа № 1, дзіцячы садок № 4. У дашкольнай установе праведзены ўцяпленне сцен, замена інжынерных камунікацый. У кінатэатр, які таксама пахарашэў і абнавіўся, купілі новую мэблю. Каля тэатра запрацаваў фантан, яго, дарэчы, таксама адкрылі падчас свята.

На тэрыторыі Дома дзіцячай і юнацкай творчасці цяпер ёсць новы спартыўны аб'ект — скейт-пляцоўка. Фінансаванне яе вялося па абласной інвестпраграме. Пляцоўку адкрылі ў лістападзе, і юныя ганцаўчане ўжо паспелі аціаніць зону актыўнага і бяспечнага адпачынку. Яна стала месцам прыцягнення для многіх.

Добраўпарадкаванне ахапіла і прывакзальную плошчу чыгуначнай станцыі Ганцавічы. Замест асфальтавага палатна з'явілася больш стыльная тратуарная плітка. Сам будынак станцыі таксама папрыгажэў, яго фасад адрамантавалі, а колькасць парковачных месцаў для тых, хто суткракае і праводзіць пасажыраў, павялічылі.

У сацыяльнай сферы асаблівы ўпор зроблены на медыцыну. З абласнога бюджэту пайшло на гэта 3,5 мільёна рублёў. Самы вялікі аб'ём работ праведзены ў паліклініцы. Замянілі ліфты і пажарную сігналізацыю. Куплена новае абсталяванне і мэбля. У рамках падрыхтоўкі да «Дажынак» рэканструкцыя вялася паэтапна, каб не перашкаджаць працэсу лячэння людзей. Тут працавалі майстры прадпрыемства «Палессежылбуд», завяршэнне работы на аб'екце стала святам і для іх. Тым больш што ўрачыстае адкрыццё паліклінікі прымеркавалі да фестывалю-кірмашу.

Міністр аховы здароўя краіны Дзмітрый ПІНЕВІЧ, які браў удзел у цырымоніі адкрыцця, адзначыў, што ахова здароўя ў Брэсцкай вобласці ў пытаннях перафармавання займае адну з лідзіруючых пазіцый. Міністр падкрэсліў, што ў працэсе работы акцэнт робіцца на развіццё лабараторнага звяна, стварэнне больш даступных дыягнастычных і тэрапеўтычных паслуг для кожнага жыхара. Сведчанне таму — і новая паліклініка. **Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА** падчас адкрыцця паліклінікі адзначыў, што ў выніку рамонту палепшаны ўмовы працы медыкаў, а пацыенты атрымалі магчымасць камфортнага, кваліфікаванага, якаснага прыёму.

Пашана за працу

Шматлікія госці фестывалю адзначалі, што свята ўражваю ў Ганцавічах праводзяць дастойна, як гэта рабілі продкі, толькі больш маштабна і відовішча. Павіншаваць хлебаробаў прыехаў **намеснік прэм'ер-міністра краіны Леанід ЗАЯЦ.** Віцэ-прэм'ер адзначыў, што на Брэстчыне зладжана, арганізавана і прафесійна праведзена работа на ўсіх этапах.

— Першымі закончылі ўборку, першымі святкуеце «Дажынкі», — падкрэсліў Леанід Заяц. — Брэсцкі рэгіён заўсёды з'яўляецца лідарам аграпрамысловага комплексу. Тут пабудавалі сучасную, высокаэфектыўную сельскую гаспадарку, цяпер бачым высокую аддачу сродкаў, якія былі ўкладзены. Кожны кілаграм корму дае прадукцыю, а кожны кілаграм збожжа дае прыбытак.

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім ЕРМАЛОВІЧ адзначыў, што фестываль працаўнікоў вёскі — цудоўнае свята: «Яно паказвае, наколькі важная для людзей увага, якую надае дзяржава развіццю сельскай гаспадаркі і тым, хто працуе на зямлі. Гэта важнае мерапрыемства як з эканамічнага, так і з палітычнага пункту гледжання».

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сяргей БАРТАШ адзначыў той факт, што чатыры раёны Брэсцкай вобласці намаляцілі больш за сто тысяч тон збожжа, і выказаў пажаданне, каб такіх раёнаў станавілася больш.

Па традыцыі ўрачыстая частка «Дыжынак» пачалася з шэсця перадавікоў жніва. Затым адбылося ўзнагароджанне, тон якому задаў прывітальны адрас ад імя кіраўніка дзяржавы аграрыям Брэстчыны. Пераможцам абласнога спаборніцтва сярод раёнаў вобласці стаў Камянецкі, на другім месцы — Жабінкаўскі, на трэцім — Пружанскі.

Сярод гаспадарак у першую чаргу адзначылі філіял «Камароўка-Агра» ААТ «Батчы» Кобрынскага раёна, ААТ «Агра-Калядзічы» Пружанскага раёна, ААТ «Арэпічы» Жабінкаўскага раёна. Па многіх намінацыях ушанавалі камбайнераў, кіроўцаў, якія адвозілі збожжа, машыністаў збожжасушыльных комплексаў, спецыялістаў гаспадарак і іншых удзельнікаў жніва. Заслужаныя ўзнагароды атрымалі 38 груп аграрыяў. Больш за сто чалавек паднімалася на сцэну толькі па ўзнагароду аблвыканкама.

Іх, герояў дня, можна было пазнаць па чырвоных стужках. Агульны настрой пераможцаў выказаў **малады камбайнер з ААТ «Крошын» Баранавіцкага раёна Аляксандр ЯРАШ,** калі сказаў: «Не чакаў нават, што ў першым сваім жніве выйду ў лік пераможцаў, але галоўнае, што мне падабаецца мая работа». Відавочна, усе, хто атрымліваў у той дзень узнагароды, любяць сваю справу, працуюць з поўнай аддачай.

Героям жніва, кіраўнікам гаспадарак, спецыялістам за іх працу, за важкі каравай рэгіёна падзякаваў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый Шулейка:

— Аграрыі спрацавалі добра. Сёлетнія паказчыкі сталі вынікам работы людзей і захавання тэхналогіі. А яшчэ памагла сучасная тэхніка. За два гады куплена каля трохсот новых камбайнаў, налета намечана купіць яшчэ каля сотні, — сказаў кіраўнік рэгіёна.

Хлебаробам Брэстчыны, несумненна, ёсць чым ганарыцца. Першымі ў краіне завяршылі ўборку з надзвычай добрымі вынікамі. Усяго атрымана 1,34 мільёна тон збожжа (без уліку грэчкі, проса, кукурузы). Ураджайнасць склала 40 цэнтнераў з гектара, што крышачку больш за леташні паказчык. Важкі намалот, напрыклад, дала азімая пшаніца — 52 цэнтнеры з кожнага гектара, іншыя культуры таксама не падвялі.

...Да позняга вечара шумеў-гуляў кірмаш у Ганцавічах. Удзельнікаў свята радавалі не толькі самадзейныя, але і прафесійныя артысты. Тэматычныя лакацыі для дзяцей і падлеткаў былі завдзейнічаны цалкам. Арганізатары кірмашу паклапаціліся не толькі пра культурную праграму, але і пра пачастункі. Можна было купіць любую смакату, пасядзець ва ўтульных вулічных кафэ, разлічаных на тры тысячы пасадачных месцаў.

Ну а пад заслону свята вырашылася яго галоўная інтрыга. Кіраўнік вобласці Юрый Шулейка перадаў эстафету «Дажынак» Лунінецкаму раёну. Налета фестываль-кірмаш пройдзе ў Мікашэвічах.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4. УНП 700016217
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. УНП 191224638 (www.ipmtorgi.by)

Предмет электронных торгов

Лот № 1
Адрес: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 164**

Здания и сооружения овощехранилища в составе: **картофелехранилище** (3052,4 кв. м, 710/С-60715), **КПП овощехранилища** (8,1 кв. м, 710/С-58338), **ограждения** (98,20 м, 710/С-81026; 138,18 м, 710/С-57185), **площадка** (3461 кв. м, 710/С-73308), **автомоб. дорога** (362 кв. м, 710/С-73307), ограждение для мусор. контейнеров (инв. № 13002000482), шкаф ШП-1 (инв. № 03386400001), щиты автоматич. (инв. № 03387000008, 03387000009, 03387000010).
***Сведения о земельном участке*:** пл. **0,9248 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания картофелехранилища

Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 271 032,34 бел. руб.
(снижена на 40 %)

Лот № 2
Адрес: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гагарина, 12**

Столовая в составе: **столовая** (2098,2 кв. м, 710/С-57661, составные части: подвал, 4 крыльца, ворота, асфальтное покрытие, забор), **склад** (125 кв. м, 710/С-60480), **склад кирпичный** (97,8 кв. м, 710/С-76250), **ограждение площадки для мусора** (710/С-57176), **тепловая сеть** (20,2 м, 710/С-79760), оборудование и ТМЦ – перечень на сайте ipmtorgi.by.
***Сведения о земельном участке*:** пл. **0,6237 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания зданий и сооружений по хранению и переработке продуктов питания

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 321 105,78 бел. руб.
(снижена на 50 %)

Лоты № 3

Павильон торговый 10*4*3, 2011 г. в. (инв. № 13001000005).
Месторасположение: Могилевская обл., г. Бобруйск, ш. Минское

Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка лота № 3 производится за счет покупателя

Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 9 964,10 бел. руб.
(снижена на 20 %)

Лоты №№ 4, 5 (Могилевская обл., г. Бобруйск, ш. Минское)

№ лота	Наименование	Начальная цена лота, бел. руб.
4	**Сборочный станок для производства автошин с посадочным диаметром 13, 14, 15 дюймов PCR/LTR 1+2** (инв. № 02662800298)	**1 241 412,34** (снижена на 40 %)
5	**Сборочный станок для производства автошин с посадочным диаметром 13, 14, 15 дюймов PCR/LTR 1+2,** г. в. 2004, инв. № 02662800299	**1 366 531,94**

Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя

Задаток **10 % от начальной цены предмета аукциона** перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **от 1 % до 10 % от итоговой цены лота**, указанных в информации об аукционе на сайте ipmtorgi.by, в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 14.06.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 26.09.2023 с 11.00 до 12.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 25.09.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35.
E-mail: auction@cpo.by

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
УП «БЕЛКОММУНПРОЕКТ» (Продавец)

Аукцион состоится **13.10.2023 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1: легковой джип VOLKSWAGEN TIGUAN,
кузов (рама) № WVGZZZ5NZAW092751.
Начальная цена с НДС 20 % – 10 000,00 руб.

Лот № 2: легковой седан VOLKSWAGEN PASSAT,
кузов (рама) № WVWZZZ3BZ5P046404.
Начальная цена с НДС 20 % – 10 000,00 руб.

Местонахождение Лотов №№ 1-2: г. Минск, ул. Широкая, 40 а.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и Организатора аукциона **ino.by.**

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by
УНП 190055182

СПАРТЫЎНЫ ДРАЙВ І СВЯТОЧНЫ НАСТРОЙ

Чым запомніўся алімпійскі дзень у Мінску

Розныя віды спорту, міні-спаборніцтвы, шматлікія актыўнасці на любы густ — у Мінску прайшоў алімпійскі дзень, які стаў дынамічнай часткай святкавання Дня горада. Другі год запар удзел у ім прымаюць і байкеры, удзельнікі H.O.G. Rally Minsk. Драйв свята змагла адчуць уся сталіца. Мотапрабег, у якім паўдзельнічаў і прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктар ЛУКАШЭНКА, стартаваў ад Кургана Славы і фінішаваў каля Палаца спорту, дзе разгарнуўся своеасаблівы спартыўны гарадок.

«Вельмі прыемна, што на свята ў Мінску прыйшло шмат людзей. Надвор'е цудоўнае, мы падрыхтавалі розныя актыўнасці. Такія святы людзей аб'ядноўваюць, і гэта выдатна», — адзначыў Віктар Лукашэнка, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Ён таксама прыняў удзел у мотапарадзе. Як заўважыў Віктар Лукашэнка, у байкераў і спартсменаў шмат пунктаў прыцягнення, многія спартсмены самі ездзяць на матацыклах, і многія байкеры займаюцца спортам. «У спартсменаў і байкераў шмат агульнага, пачынаючы ад прынцыпаў і заканчваючы здаровым ладам жыцця. Таму ў нас атрымалася вельмі ўдалая калабарацыя», — адзначыў кіраўнік НАК Рэспублікі Беларусь.

У размове з журналістамі Віктар Лукашэнка закрануў і пытанні міжнароднай тэматыкі. «Беларусь прымае актыўны ўдзел у міжнародным спартыўным руху. Мы ўжо запрошаны на розныя чэмпіянаты свету, аднак пакуль у нейтральным статуце. Гэта не зусім справядліва, але пакуль гэта так. Ёсць у нас вынікі, і дастаткова нядрэнныя, асабліва сярод моладзі, — сказаў ён. — У Беларусі таксама вельмі добра наладжана ўзаемадзеянне з алімпійскім камітэтам Расіі, Міністэрствам спорту. Мы праводзім розныя мерапрыемствы. Цяпер ідзе Кубак Садружнасці па біятлоне, вельмі напружаная барацьба. Вельмі сур'ёзная канкурэнцыя. Вядома, можа, крыху не хапае міжнародных спаборніцтваў, але ўпэўнены, што мы ў хуткім часе да іх прыйдзем, — дадаў кіраўнік Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

А каб на буйныя міжнародныя старты вярнуліся моцныя спартсмены, неабходна рыхтаваць спартыўны рэзерв, прыцягваць дзяцей у секцыі. **Старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ** звярнуў увагу, што пасля алімпійскага дня ў спартыўных секцыях горада варта чакаць прытоку дзяцей. Па яго словах, II Гульні краін СНД, якія прайшлі ў жніўні, паказалі, што многія віды спорту карыстаюцца вялікай папулярнасцю. «Упэўнены, алімпійскі дзень толькі пацвердзіць, што спорт — наш нацыянальны здабытак», — падкрэсліў Уладзімір Кухараў.

Падчас алімпійскага дня кожны від спорту дэманстраваў свае самыя цікавыя асаблівасці. Беларуская федэрацыя баскетбола пад купалам «Палова-арэны» правяла конкурсы баскетбольнага майстэрства. Кожны ахвотны мог папрактыкавацца ў вядзенні мяча, дакладнасці кідкоў з розных пунктаў і са штрафной лініі, паспрабаваць сілы ў заданнях на каардынацыю. Трэнеры баскетбольнага клуба «Мінск» і СДЮШАР «Гарызонт» правялі для ўсіх зацікаўленых майстар-класы. «Свята выдатнае. Самае галоўнае, што людзям падабаецца, асабліва дзецям. Відаць, што горад чакае гэтай падзеі, і ўсе разумеюць, наколькі яна будзе яркай, відовішчнай. Мне падабаецца, што Нацыянальны алімпійскі камітэт Рэспублікі Беларусь разам з горадам насычае гэтае спартыўнае свята яшчэ і дынамічнай культурнай праграмай, якая — як і ў нас у баскетболе 3х3 — надае добры драйв мерапрыемству. На мой погляд, федэрацыі прэзентуюць свае віды спорту на высокім узроўні: сапраўды выкарыстоўваюць крэатыўны падыход, задумваюцца аб тым, як захапіць дзетак, прыдумляюць шмат цікавых актыўнасцяў, — падзяліўся ўражаннямі **Максім РЫЖАНКОЎ, старшыня Беларускай федэрацыі баскетбола, першы намеснік старшыні Адміністрацыі Прэзідэнта.** Ён таксама адзначыў, што ўсе, хто хоча прыцягнуць сваё дзіця да актыўнага ладу жыцця, прыйшлі на алімпійскі дзень. У рамках свята праходзіў і баскетбольны фестываль «Крок у будучыню», які з'яўляецца часткай буйнога міжнароднага праекта. «Усе нашы праекты накіраваны не на завяванне медалёў, хоць важныя і яны, а на папулярызацыю здаровага ладу жыцця, спорту. Ніхто мяне не пераканае, але баскетбол для дзяцей — самая даступная гульня. Абапіраючыся на масавыя віды спорту, мы рэалізоўваем свае праекты. І вельмі паспяхова. І як вішанька на торце — па выніках гэтых праектаў, удзелу нашых камандаў міжнародных турнірах колькасць аматараў баскетбола расце: у верасні-кастрычніку мы назіраем кратнае павелічэнне ахвотных займацца гэтым відам спорту, падкрэсліў Максім Рыжанкоў.

І калі летнім відам спорту прэзентаваць сябе было нескладана, то зімовым прыйшлося праявіць кемлівасць, каб цёплым сонечным днём прадставіць свае магчымасці. Але яны справіліся. Беларускі лыжны саюз прадставіў унікальны трэнажор, на якім да спаборніцкага сезона рыхтуюцца спартсмены.

«Мы жывём па прынцыпе «рыхтуй лыжы ўлетку». Алімпійскі дзень — якраз такое свята, якое дазваляе людзям прасякнуцца духам спорту і знайсці сабе від спорту па душы і перавагах. Гэта вельмі класны праект, які стварае вольны час для дзяцей, а гэта будучыня нашага спорту. У нас ёсць пэўныя тэхнічныя магчымасці, каб прэзентаваць наш від спорту. І мы спадзяёмся, што гэта знойдзе свой водгук у наведвальнікаў алімпійскага дня», — адзначыў **Аляксандр ГРЭБНЕЎ, генеральны сакратар Беларускага лыжнага саюза.**

Алімпійскі дзень сабраў мноства знакамітых спарстменаў. Напрыклад, невялікія майстар-класы праводзіў **чэмпіён свету па самба, пераможца і прызёр чэмпіянатаў Еўропы па дзюдо Андрэй КАЗУСЁНАК.** Спартсмен таксама прадставіў сваю калекцыю медалёў. Ён спадзяецца, што яго ўзнагароды натхняць дзяцей на плённыя трэніроўкі і паспяховыя выступленні.

З тонкасцямі гарналыжнага спорту дзяцей знаёміла **найлепшая гарналыжніца краіны Марыя ШКАНАВА. Хакеіст «Дынама-Мінск» Дзмітрый КОРАБАЎ** не стамляўся раздаваць аўтографы і рабіць сэлфі з юнымі паклоннікамі. Ахвотных было вельмі шмат, але хакеіст не адмовіў нікому. **Знаменіты беларускі баскетбаліст Аляксандр КУДРАЎЦАЎ** расказаў, што на такія мерапрыемствы традыцыйна прыходзіць са сваімі сынамі. Сям'я прымала ўдзел у фестывалі «Вытокі», не прапусціла і алімпійскі дзень. «Настрой выдатны, я атрымліваю станоўчы зарад эмоцый. Майму малодшаму сыну на «Вытоках» вельмі спадабаўся гандбол, таму буду размаўляць з гандбольнымі трэнерамі аб тым, каб запісаць сына ў секцыю», — расказаў Аляксандр Кудраўцаў.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Падзея

САМАЯ АКТЫЎНАЯ ТРАДЫЦЫЯ ВОСЕНІ

Прайшоў Мінскі паўмарафон

«Бяжым разам» — пад такім дэвізам 13-ы раз у сталіцы прайшоў Мінскі паўмарафон. Сёлета знакаміты забег сабраў 15 тысяч актыўных і жыццярадасных людзей з 17 краін свету. Галоўнае новаўвядзенне гэтага года — фініш на полі Нацыянальнага алімпійскага стадыёна «Дынама». Такім чынам, аматары бегу не толькі атрымалі эмоцыі ад відаў нашай сталіцы, але і зведалі тыя пачуцці, якія адчувае прафесійны спартсмен, выступаючы на міжнародных спаборніцтвах.

Самай масавай стала дыстанцыя на 5 кіламетраў. Пераможцамі на ёй сталі Таццяна Рацкевіч і Аляксандр Шусцік. Пераможцы забегу адзначылі неверагодную падтрымку балельшчыкаў, якую адчувалі на працягу дыстанцыі. Дарэчы, на старт дыстанцыі ў пяць кіламетраў выйшла і новая «Міс-Беларусь» Элеанора Качалоўская. «Я ўдзельнічаю ў паўмарафоне з 2017 года і лічу, што гэта ўжо мая асабістая традыцыя — быць у коле аднадумцаў, якія гараць спортам. Вельмі рада, што ў Беларусі з'яўіся масавы спартыўны дух!» — расказала дзяўчына. Кампанію ёй склала сяброўка па конкурсе ўладальніца тытула «Міс топ-мадэль» Надзея Толсцікава.

Першымі да фінішу на дыстанцыі ў 10 кіламетраў прыбеглі Таццяна Шабанава і Уладзіслаў Церашонак. Галоўную

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

дыстанцыю ў 21 097 км першымі адолелі Марына Даманцэвіч і Рынас Ахмадзееў. «Была ўпэўнена ў сабе і сваёй перамозе. Настройвалася толькі выйгрываць, таму змагалася да канца, прытрымлівалася сваёй тактыкі. Зрабіла ўсё так, як планавала, таму задаволеная», — падзялілася **Марына ДАМАНЦЭВІЧ.**

Важнай часткай Мінскага паўмарафону ўжо шмат гадоў з'яўляецца сямейны забег і дабрачынны забег. Такім чынам падкрэсліваецца, што паўмарафон — больш, чым проста спорт, больш, чым звычайны забег. Гэта свята, якое аб'ядноўвае актыўных жыццялюбівых людзей, здольных дарыць пазітыў і яркія эмоцыі. Кожны рэгіструецца на Мінскі паўмарафон са сваёй мэтай — добра правесці час, знайсці сяброў, дапамагчы іншаму, праверыць сябе. Арганізатары кожны год улічваюць гэта і робяць паўмарафон цікавым для кожнага.

«На ўсіх стартах мы імкнёмся зрабіць так, каб удзельнікам было камфортна. У гэтым годзе павялічылі стартавую зону, каб у ёй змаглі размясціцца ўсе ўдзельнікі, пашырылі сямейны забег. Раздзявалкі, душавыя, камеры захоўвання — усё было падрыхтавана. Цягам тыдня будзем падводзіць вынікі. Прыслухаемся да ўражанняў і пажаданняў удзельнікаў, каб улічыць іх у падрыхтоўцы да наступнага паўмарафону. Калі праходзяць такія мерапрыемствы, рэгістрацыя звычайна заканчваецца загадзя, каб арганізатары, маючы ўяўленне аб колькасці ўдзельнікаў, маглі стварыць для іх камфортныя ўмовы. Мы ж стараемся трымаць рэгістрацыю адкрытай да апошняга. Ідзём насустрач — бегавы рух у Беларусі толькі зараджаецца, але, думаю, у яго перспектыўная будучыня», — адзначыў **старшыня Беларускай федэрацыі лёгкай атлетыкі Іван ЦІХАН.**

Матэрыялы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества
ОАО «МТЗ» (Продавец)

Аукцион состоится **27.09.2023 в 14.00** по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Лот № 1 в составе:

1. Здание карантинника на 300 голов, 407,5 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149390, инв. № 100403.
2. Механизированное зернохранилище емкостью 1000 т, 714,9 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149386, инв. № 100365.
3. Убойный пункт свинотоварной фермы на 1000 голов, инв. № 100341, 143,3 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149316, инв. № 100341.
4. Дезбарьер, площадь застройки 77,0 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149320, инв. № 104596.
5. Канализация бытовая, 285,0 м: № по ЕГРНИ 600/С-149330, инв. № 104590; инв. № 104589.
6. Здание свинарника-откормочника на 1000 голов, 1604,9 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149327, инв. № 100404.
7. Весовая, 87,0 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149391, инв. № 100342.
8. Хранилище для картофеля, овощей и фруктов, 663,8 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149387, инв. № 100364; инв. № 100561; инв. № 104594.
9. Водопровод пожарно-питьевой, 1573,8 м: № по ЕГРНИ 600/С-149389, инв. № 104591.
10. Здание свинарника для откорма на 1000 голов, 2591,1 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149331, инв. № 100339; инв. № 101594; инв. № 101743; инв. № 101740; инв. № 104593; инв. № 211241.
11. Трансформаторная подстанция свинотоварной фермы, 45,6 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149338, инв. № 100340; инв. № 185127; инв. № 185021; инв. № 185022;
12. Сборно-разборное здание арочник, 972,3 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149388, инв. № 100333.
13. Мастерская ремонтно-технической базы до 40 тракторов, 379,5 кв. м: № по ЕГРНИ 600/С-149326, инв. № 100363.

14. Движимое имущество:

- камера холодильная, инв. № 175345;
- резервуар Р-5066, инв. № 114096;
- резервуар Р-5066, инв. № 114097;
- трансформатор ТМ-250/10-83У1-10/0,4, инв. № 113324;
- трансформатор ТМ-2501-10-83У1-10/0,4, инв. № 113325;
- весы автомобильные 500-2РС-30Ц, инв. № 119734;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126556;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126557;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126558;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126559;
- шкаф управления ШАУ-АВ, инв. № 126560.

Адрес Лота: Республика Беларусь, Минская обл., Минский р-н, Луговослободской с/с, 15/17; 15/21; 15/24; 15/23; около д. Обчак; 15/18; 15/25; 15/20; 15/19; 15/26; 15/22; 15/27, район д. Обчак.
Земельный участок 623684100001000288, 7,3507 га.
Право постоянного пользования.

Начальная цена с НДС 20 % – 3 962 521,33 руб.
Задаток – 500 000,00 руб. **Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатка – 25.09.2023 в 11.00.

Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению ликвидатора
ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»
(222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б)
проводит открытый аукцион по продаже:

ЛОТ № 1: ЗДАНИЕ ПРОХОДНОЙ

с инв. № 630/С-46867 общей площадью 10,4 кв. м,
адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/1.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 1 596,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **159,00** бел. руб.

ЛОТ № 2: КОТЕЛЬНАЯ

с инв. № 630/С-46858 общей площадью 528,7 кв. м,
адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Сухая, 89/7.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 47 796,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **4 779,00** бел. руб.

Здание проходной и котельная расположены на земельном участке с кадастровым номером 640000000001000776 (право постоянного пользования) площадью 5,3062 га, для их обслуживания будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.

Стоимость лотов снижена на 30 %. Шаг аукциона: 5 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 22.06.2023, 27.07.2023.

Аукцион состоится **26.09.2023 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.09.2023** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17,
телефон для осмотра: 8 (029) 351 10 33.

УНП 600077220

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

Продавец: открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР» 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81 тел.: 8 (0212) 55-11-81, 8 (044) 5941732.

Лот № 1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-187148 площадью 212,3 кв. м, наименование – склад, назначение – складское помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81-22. Наличие мест общего пользования.

Обязательное условие аукциона по лоту № 1: обязанность покупателя обустроить отдельный вход в приобретаемое им изолированное помещение.

Нач. цена: 16 014,69 бел. руб. без учета НДС.

Задаток: 1601,46 бел. руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 28.09.2023 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 13.09.2023 с 08.30 по 27.09.2023 до 17.30.

Заявления на участие в повторном аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901.

Условия повторного аукциона: Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по нач. цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и представлением участникам документации, необходимой для его проведения на р/с, указанный в протоколе аукциона; подписать договор купли-продажи в течение 20 кал. дней со дня проведения аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета аукциона. Расходы Продавца на подготовку документов по лоту № 1 – 204,36 бел. руб. с НДС (паспортизация, регистрация).

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и представлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона.

Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом **по тел. +375 (33) 611 40 46, Труханович Александр Владимирович.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(организатор аукциона)
по поручению ликвидатора
ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»
(222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б)
проводит открытый аукцион по продаже:

ЛОТ № 1: ДИСПЕТЧЕРСКИЙ ПУНКТ С ПРОХОДНОЙ

с инв. № 630/С-79862 общей площадью 121,5 кв. м,
адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б/9.
Начальная цена с НДС (20 %) – **33 343,23** бел. руб.
Цена снижена на 10 %.
Задаток 10 % от начальной цены – **3 334,00** бел. руб.

ЛОТ № 2: МАСТЕРСКАЯ

с инв. № 630/С-79865 общей площадью 2 193,7 кв. м,
адрес: Минская область, г. Молодечно, ул. ул. Молодежная, 2Б/8.
Начальная цена с НДС (20 %) – **306 720,00** бел. руб.
Цена снижена на 10 %.
Задаток 10 % от начальной цены – **30 672,00** бел. руб.

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 623850100002004253 (право постоянного пользования) площадью 4,6001 га, для обслуживания будет выделена доля в праве на указанный земельный участок.

Шаг аукциона: 5 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от **01.08.2023.**

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника предмет торгов продается ему по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Аукцион состоится **26.09.2023 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **25.09.2023** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11,
телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.

УНП 600077220

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА) ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «ИСКОЖ» В ПРОЦЕССЕ ЛИКВИДАЦИИ

Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) – извещение о проведении публичных электронных торгов опубликованы 08.08.2023 в газете «Звязда» № 151 (30031), стр. 6

Аукцион состоится **26.09.2023, начало: 10.00,** окончание: **16.00** на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) iintorgi.by.
Время приема заявок: **с 12.09.2023 09.00 до 25.09.2023 г. 16.00**

Организатор аукциона: ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

Продавец: ОАО «Искож», УНП 200250840, 225710, Брестская область, г. Пинск, ул. Брестская, д. 57.
Ликвидатор Будкевич Николай Петрович, +375 (44) 568-06-70

Лот № 1: Имущество ОАО «Искож», состоящее из 509 единиц основных средств (объекты недвижимости. оборудование действующего производства, вычислительная техника, измерительные приборы, инвентарь), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 144500000021000048, площадью 2,8984 га, по адресу: г. Пинск, ул. Корбута, 57. Объект аукциона находится в залоге, в объекте имеются арендаторы.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 11 239 869,68 бел. руб.
Размер задатка – 10 % от начальной цены лота. Шаг торгов – 5 % от начальной цены лота.
Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения аукциона, информация об имуществе, входящем в состав лота, размещены на официальном сайте ЭТП «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by.
Задаток перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа: ООО «Индустрия Инноваций»

Контактные тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95;
e-mail: e.pinchuk@iin.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638
Продавец	ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38, УНП 101063229. Тел. + 375 29 688-04-88

Предмет аукциона

Местоположение лотов №№ 1-3 –
Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников, 3

Лот № 1

Изолированные помещения:
№ 1 (производственное помещение, 600/D-91728) 206,3 кв. м,
№ 2 (административное помещение, 600/D-91729) 221,7 кв. м,
№ 3 (производственное помещение, 600/D-91730) 288,4 кв. м,
складское помещение (600/D-40243) 205,2 кв. м

Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 1 486 800,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 74 340,00 бел. руб.

Лот № 2

Административное помещение (этаж 3, 600/D-40239) 233,6 кв. м

Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 480 000,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 24 000,00 бел. руб.

Лот № 3

Административное помещение (этаж 5, 600/D-40241) 83,9 кв. м

Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 165 600,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 8 280,00 бел. руб.

Обременение: площади помещений (лоты №№ 1–3) частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона ipmtorgi.by)

Порядок ознакомления: в рабочие дня по предварительному согласованию. +375 (29) 680-80-99 (Шубко Юлия Владимировна)

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».
К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

Задаток по лотам №№ 1, 2 – 1 %, по лоту № 3 – 2 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить организатору аукциона вознаграждение 3 % от цены продажи лота в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	**25.09.2023 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»
Дата и время начала и окончания приема заявлений	**С 09.00 12.09.2023 до 17.00 22.09.2023,** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Контакты: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06,
auction@ipmconsult.by

ПЛЯЦОЎКА ПЕДАГАГІЧНАГА МАЙСТЭРСТВА НАЦЫЯНАЛЬНАГА МАШТАБУ

ДОСВЕД, ЯКІМ ТРЭБА ДЗЯЛІЦЦА

— Алег Віктаравіч, конкурс «Настаўнік года» праводзіцца на рэспубліканскім узроўні раз у тры гады. Ці не занадта вялікая паўза? Школа і сучасныя дзеці імкліва мяняюцца. Ёсць рызыка адстаць ад патрабаванняў, якія грамадства прад'яўляе да сучаснага настаўніка...

— Спецыфіка падрыхтоўкі і правядзення конкурсу такая, што фактычна паўзы няма. Хачу звярнуць увагу, што кожны конкурс праводзіцца ў чатыры этапы, і першы з іх, на ўзроўні ўстаноў адукацыі, праходзіць за год да фіналу. Другі і трэці этапы праходзяць адпаведна на раённым (гарадскім) і абласным узроўнях. А далей — рэспубліка, фінал. Таму, як кажуць, перыяд «ад конкурсу да конкурсу» займае ўсяго два гады.

Рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў «Настаўнік года» становіцца своеасаблівым арыенцірам для вызначэння напрамкаў для далейшага развіцця сістэмы адукацыі. Гэта ўнікальная пляцоўка нацыянальнага маштабу, якая дазваляе раскрыцца педагагічнаму таленту настаўнікаў, выявіць творчых, ініцыятыўных, энергічных і мэтанакіраваных педагогаў, надаць імпульс сістэмнай рабоце ўсёй метадычнай «вертыкалі».

На ўсіх этапах конкурс праводзіцца па васьмі намінацыях. У кожнай намінацыі вызначаецца пераможца конкурсу, а на трэцім і чацвёртым этапах — пераможцы і лаўрэаты.

Безумоўна, сучасны свет і грамадства інтэнсіўна мяняюцца. Але, па маім глыбокім перакананні, школа павінна заставацца на кансерватыўных, класічных пазіцыях, асабліва калі гаворка ідзе пра выхаванне асобы. Традыцыйныя беларускія каштоўнасці — гэта тая канстанта, дзякуючы якой мы адбыліся як нацыя, здольная адэкватна адказваць на выклікі часу. Што ж датычыцца адукацыйных тэхналогій, то яны, без усякага сумнення, перажываюць змены, і мы арыентаваныя на ўкараненне ў практыку найбольш эфектыўных з іх, дзякуючы якім педагогі дасягаюць пастаўленых мэт, а вучні паспяхова асвойваюць адукацыйныя праграмы і набываюць неабходныя для жыцця веды, уменні і навыкі. Дарэчы, выяўленню, абагульненню і распаўсюджванню перадавога педагагічнага вопыту і садзейнічае конкурс педагагічнага майстэрства.

— Мяркую, што не так лёгка рашыцца на ўдзел у конкурсе. Як правіла, добры настаўнік загружаны работай больш чым 24 гадзіны ў суткі, а таксама рэгулярна з'яўляецца штосьці запланавае. І адважыцца раптам на нешта яшчэ, што патрабуе сіл, аддачы і шмат часу, зусім няпроста! З аднаго боку, настаўнік у школе — публічная асоба, з другога — конкурс патрабуе ад яго іншага ўзроўню публічнасці, гатоўнасці адчыніць дзверы сваёй педагагічнай лабараторыі і ўмення падзяліцца яе зместам. А наколькі актыўныя былі настаўнікі падчас удзелу ў рэгіянальных адборачных этапах?

— Конкурсы прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў праводзяцца ў Беларусі пачынаючы з 1991 года. Спачатку гэта былі рэспубліканскія этапы Усесаюзнага конкурсу. Першым і адзіным «Настаўнікам года СССР» стаў у 1991 годзе настаўнік фізікі мінскай сярэдняй школы № 49 Валерый Гербутаў. А з 1995 года конкурсы педагагічнага майстэрства сталі рэспубліканскімі.

Удзел у конкурсе вельмі прэстыжны для педагогаў. І вось чаму. Па-першае, гэта прафесійнае і грамадскае прызнанне педагагічнага майстэрства асобна ўзятага настаўніка ці выхавацеля. Па-другое, конкурс садзейнічае далейшаму кар'ернаму росту педагогаў. З ліку канкурсантаў вырасла нямала кіраўнікоў устаноў адукацыі, педагогаў-наватараў і вучоных.

Конкурс дае магчымасць найбольш ініцыятыўным і творчым педагогам рэтрансліраваць на сістэмнай аснове вопыт сваёй работы ў постконкурсны перыяд. Пагадзіцеся, гэта ўнікальная магчымасць. Удзельнікі конкурсу вельмі запатрабаваныя на курсах павышэння кваліфікацыі педагогаў, семінарах, майстар-класах, у педагагічных майстэрнях і іншых мерапрыемствах дадатковай адукацыі дарослых. Да іх аўтарытэтнай прафесійнай думкі сёння прыслухоўваецца педагагічная супольнасць. Таму, нягледзячы на загружанасць штодзённымі настаўніцкімі справамі, тысячы ініцыятыўных педагогаў з усіх куткоў нашай краіны імкнуцца ўзяць удзел ва ўсіх чатырох этапах конкурсу. Толькі на трэцім абласным і Мінскім гарадскім этапе ў конкурсе ўзялі ўдзел 753 педагогі: у Брэсцкай вобласці — 105, у Віцебскай — 117, Гомельскай — 100, Гродзенскай — 86, Мінскай — 158, Магілёўскай — 105 і ў Мінску — 82.

Падкрэслю: гэта найлепшыя педагагічныя кадры краіны, якія гатовыя публічна, на ўсю Беларусь, прадэманстраваць і абараніць у конкурсных спаборніцтвах напрацаваны гадамі педагагічны вопыт.

ПАРТРЭТ ФІНАЛІСТАЎ

— Традыцыйна ў фінальную частку рэспубліканскіх спаборніцтваў трапляюць яркія харызматычныя настаўнікі, людзі з творчым мысленнем і нестандартнымі метадамі работы, якія даказваюць штодня, што ў школе няма цяжкіх прадметаў. Калі прааналізаваць узроставы склад фіналістаў і іх педагагічны стаж, то каго сярод іх больш: маладых ці сталых? Ці можа маладзь складаюць дастойную канкурэнцыю сваім больш досведчаным калегам? Не сакрэт, што дзеці часта любяць менавіта маладых настаўнікаў...

— Дзеці любяць розных педагогаў. І гэта залежыць, у першую чаргу, ад саміх настаўнікаў і выхавацеляў, ад іх педагагічнага майстэрства, прадметных кампетэнцый, ад уменняў ўлюбіць дзіця ў свой навучальны прадмет, ад навыкаў правільна «разруліць» самыя складаныя педагагічныя сітуацыі. Таму ўжо на трэцім этапе ўдзельнікі конкурсу павінны былі прадставіць і вопыт сваёй педагагічнай дзейнасці, і зрабіць творчае самапрадстаўленне, і прайсці псіхолага-педагагічнае тэсціраванне ў мэтах праверкі ведаў у галіне вучэбнага прадмета, псіхалогіі, педагогікі, выхавання. Таксама канкурсанты правялі адкрытыя ўрокі і заняткі ў незнаёмым класе або групе, майстар-класы для педагагічных работнікаў або студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі. Адбор праводзіўся вельмі сур'ёзны. І вось па выніках конкурсных мерапрыемстваў былі вызначаны 56 пераможцаў ва ўсіх намінацыях, якія і будуць змагацца ў фінальнай частцы спаборніцтваў за званне «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь — 2023».

Сярэдні ўзрост удзельнікаў фіналу складае прыкладна 39 гадоў. Усе маюць вышэйшую адукацыю. Сярэдні стаж педагагічнай дзейнасці фіналістаў — 15,5 года. 15 педагогаў маюць стаж да дзесяці гадоў, 27 педагогаў — да 20 гадоў і 13 педагогаў — да 30 гадоў. Найбольшы стаж работы (31 год) у настаўніка біялогіі са слуцкай гімназіі № 1 Іны Хаўстовіч, а найменшы (пяць гадоў) — у настаўніка дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўкі (модуль — медыцынская падрыхтоўка) сталічнай гімназіі № 43 Вольгі Зелянко. Хоць прадстаўніцтва мужчын у настаўніцкім корпусе па краіне нязначнае, у фінале педагогаў мужчын — 14 чалавек.

Варта адзначыць, што ў параўнанні з папярэднім конкурсам значна вырас кваліфікацыйны ўзровень педагогаў, а гэта, пагадзіцеся, важны паказчык прафесійнага майстэрства. Так, у сёлетнім конкурсе ўдзельнічаюць пяць настаўнікаў-метадыстаў, 42 педагогі маюць вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю і дзевяць педагогаў — першую кваліфікацыйную катэгорыю.

Заўважу, што два педагогі ўдзельнічаюць у конкурсе ў другі раз: гэта настаўнік фізікі з бабруйскай сярэдняй школы № 34 Святлана Здаранкова і настаўнік беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 16 горада Мазыра Яўген Есіс.

У конкурсе бяруць удзел педагогі як з гарадскіх, так і з сельскіх школ. Напрыклад, ужо трэці раз у чацвёртым (заключным) этапе конкурсу актыўны ўдзел бярэ настаўнік геаграфіі з Межысецкай сярэдняй школы Магілёўскага раёна Андрэй Трэй. Звяртаю вашу ўвагу, што інфармацыю пра ўсіх удзельнікаў заключнага этапу конкурсу можна паглядзець на вэб-сайце Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Акрамя таго, выставачныя стэнды з інфармацыяй аб канкурсантах размешчаны ў фае нашай Акадэміі.

УБАЧЫЦЬ «ПЕДАГАГІЧНУЮ СУТНАСЦЬ»

— У штодзённай рабоце жыццё пастаянна падкідвае педагогам нестандартныя сітуацыі. А якія з выпрабаванняў у фінале, на вашу думку, могуць найбольш поўна раскрыць асобу педагога і за якія можна атрымаць найбольшую суму балаў? Што ўвогуле больш важнае: тэорыя, методыка ці практыка? Можна проста выдатна адказаць на пытанні ў псіхалагічным тэсціраванні, але праваліць гасцявы ўрок у незнаёмай аўдыторыі...

— Тэорыя і практыка — як два крылы ў птушкі, усе важныя, без іх немагчымы палёт, у тым ліку і педагагічны, творчы. Таму мяркую, што раскрыць асобу педагога дазваляюць абсалютна ўсе мерапрыемствы конкурсу. І справа зусім не ў балах. Балы дазваляюць толькі «алічбаваць» дасягненні канкурсанта, але галоўнае ж не гэта.

Праз конкурсныя мерапрыемствы, а менавіта праз прадстаўленне вопыту педагагічнай дзейнасці, самапрадстаўленне, «праектаванне ўрока (заняткаў)», правядзенне ўрокаў (заняткаў) па прапанаванай журы тэме, выступленне перад грамадскасцю па асноўных аспектах прадстаўленага вопыту педагагічнай дзейнасці, педагагічнае і псіхалагічнае тэсціраванне, майстар-класы мы ўбачым патэнцыял кожнага канкурсанта, увасабленне на практыцы яго «педагагічнага крэда».

Усе конкурсныя мерапрыемствы дазваляюць за невялікі адрэзак часу ўбачыць «педагагічную сутнасць» кожнага ўдзельніка конкурсу. Ну а што датычыцца балаў за конкурсныя мерапрыемствы, то тут ніякай таямніцы няма. Такім чынам, за самапрадстаўленне можна атрымаць максімум 20 балаў, за вопыт педагагічнай дзейнасці — 50 балаў, за псіхолага-педагагічнае тэсціраванне — 80 балаў, праектаванне ўрока «каштуе» сто балаў, за выступленне перад грамадскасцю — 40 балаў, урок-імправізацыя пацягне на сто балаў, самааналіз урока — 30 балаў і майстар-клас — 80 балаў. Такім чынам, максімум складае 500 балаў.

Па выніках правядзення конкурсных мерапрыемстваў журы ў кожнай намінацыі вызначае аднаго пераможцу і двух лаўрэатаў. Пераможцы ў кожнай намінацыі становяцца ўдзельнікамі суперфіналу — гэта восем педагагічных работнікаў.

Суперфінал заключнага этапу конкурсу пройдзе 27 верасня ў актавай зале Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі. На дадзеным этапе канкурсантам неабходна будзе прайсці праз наступныя выпрабаванні: вырашэнне педагагічных сітуацый, міні-ўрок (міні-занятак) на сцэне і публічнае выступленне на тэму «Выхаваць чалавека...».

Хачу дадаць, што фінал конкурсу — гэта не толькі прафесійныя спаборніцтвы педагогаў, а яшчэ і магчымасць прадэманстраваць усяму грамадству, што настаўнік — універсальная прафесія, якая патрабуе ад яе ўладальніка мэтанакіраванасці і самаадданасці, незвычайнай душэўнай шчодрасці, павагі і, самае галоўнае, любові да сваіх вучняў.

РЭАЛІЗАВАЦЬ СЯБЕ

— Кожны конкурс прафесійнага майстэрства дае магчымасць раскрыць педагагічныя таленты, абагульніць вопыт і трансліраваць новыя педагагічныя практыкі на ўсю краіну. Што з прэзентаванага канкурсантамі на папярэднім конкурсе было ўзята ў школе на ўзбраенне? Наколькі ўвогуле актыўныя папярэднія ўдзельнікі конкурсу?

— Конкурс прафесійнага майстэрства — знакавае мерапрыемства для ўсёй нацыянальнай сістэмы адукацыі, якое падтрымліваецца кіраўніком нашай дзяржавы. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка традыцыйна сустракаецца з фіналістамі конкурсу і ўручае пераможцу галоўны прыз конкурсу — «Хрустальны журавель».

Для арганізацыі супрацоўніцтва настаўнікаў яшчэ ў 2007 годзе ў Беларусі быў створаны клуб «Хрустальны журавель», які аб'ядноўвае арганізатараў і ўдзельнікаў конкурсаў розных гадоў.

За час дзейнасці клуба адбылося больш за 70 метадычных мерапрыемстваў «Хрустальнага жураўля» ў розных рэгіёнах нашай краіны. У рамках семінараў-акцый праведзена больш за 800 адкрытых урокаў і майстар-класаў, у якіх узяло ўдзел каля дзесяці тысяч педагагічных работнікаў.

Трэба адзначыць, што пераможцы і ўдзельнікі конкурсу мінулых гадоў актыўна ўдзельнічаюць у дзейнасці клуба. Гэта пераможца 2001 года Вадзім Шпетны, пераможца 2004 года Ігар Якіменка, пераможца 2006 года Ірына Клявец, пераможца 2011 года Інэса Зубрыліна, пераможца 2014 года Віктар Жук і іншыя.

Пры актыўным удзеле членаў клуба праведзена 12 фестываляў педагагічнага майстэрства, у тым ліку чатыры — для маладых педагогаў.

Многія педагогі, якія бралі ўдзел у конкурсах прафесійнага майстэрства, сталі кіраўнікамі ў сістэме адукацыі, занялі розныя кіраўніцкія пасады. Так, Валянціна Гінчук узначальвае Нацыянальны інстытут адукацыі, Вольга Блажко — прарэктар Гомельскага інстытута развіцця адукацыі. Дырэктарамі школ сталі Ігар Якіменка, Алена Ананчыкава, Ірына Матузава.

Спіс паспяховых і таленавітых педагогаў — удзельнікаў рэспубліканскага конкурсу можна працягваць бясконца. Для ўсіх нас важна, каб настаўнікі і выхавальнікі змаглі эфектыўна рэалізаваць сябе ў прафесіі, не выгараць і не расчаравацца ў справе жыцця.

Стаўшы флагманамі педагагічнай супольнасці, выхавальнікамі і настаўнікамі для падрастаючых пакаленняў, яны ўвасобілі ў жыццё асноўны прынцып педагогікі, сфармуляваны вялікім савецкім педагогам Васілём Сухамлінскім, — «Сэрца аддаю дзецям».

Хачу дадаць, што паралельна з конкурсам «Настаўнік года» ў Беларусі ўпершыню праходзіць рэспубліканскі фестываль «Педагагічны дэбют». Ён праводзіцца ў чатырох намінацыях: сярод маладых дырэктараў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, маладых загадчыкаў устаноў дашкольнай адукацыі, маладых настаўнікаў і маладых выхавальнікаў дашкольных устаноў. Да ўдзелу ў ім дапускаліся маладыя педагогі і кіраўнікі ўстаноў ва ўзросце да 31 года, якія маюць стаж работы на пасадзе не больш як пяць гадоў незалежна ад кваліфікацыйнай катэгорыі.

Мы лічым, што сёння вельмі важна падтрымаць не толькі вопытных педагогаў, але і маладых настаўнікаў, якія толькі прыходзяць у прафесію. Падтрымаць і тых, хто працуе з самымі маленькімі дзецьмі: выхавальнікаў, загадчыкаў устаноў дашкольнай адукацыі. Таму што менавіта ў гэтым узросце закладваюцца самыя важныя якасці асобы.

Рэспубліканскі этап фестывалю будзе праводзіцца з 25 да 28 верасня ў вочным фармаце. Удзел у ім возьмуць 25 педагагічных работнікаў. Усе конкурсныя мерапрыемствы разгорнуцца на базе Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. А 28 верасня пройдзе ўзнагароджанне ўдзельнікаў фестывалю разам з удзельнікамі заключнага этапу конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь». Маладыя педагогі будуць удзельнічаць ва ўрачыстай імпрэзе да Дня настаўніка ў Палацы Рэспублікі.

Пажадаем усім канкурсантам поўнай унутранай мабілізацыі і ўдачы ў прафесійных спаборніцтвах.

Надзея НІКАЛАЕВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«СУСТРЭНЬ БРАТОЎ МАІХ, СЯСЦЁР І РУКУ ІМ ПАДАЙ!»

Як беларускія літаратары адгукнуліся на 17 верасня 1939 года на старонках друку

Дзень, калі Заходняя Беларусь нарэшце злучылася з Усходняй, беларусы чакалі па абодва бакі мяжы. Зразумела, пісьменнікі і паэты адразу адгукнуліся на гэтую доўгачаканую падзею. Яшчэ ў 1936 годзе Янка Купала ў вершы «Якубу Коласу» пiша:

«Ды веру: хутка, незадоўга,
У непрымушанай ахвоце,
З табой нябеснаю дарогай
Мы паляцім на самалёце.
Мы паляцім над Нёман сіні,
Над бор, ад князя ўжо свабодны,
Загляне, хто жыве ў хаціне,
Дзе жыў ты, брат, з жыццём нязгодны».

Родныя мясціны Якуба Коласа апынуліся па той бок мяжы, у панскай Польшчы, там засталіся і многія яго сваякі. У 1919 г. Колас пісаў:

«Благаславёны час той будзе,
Калі я ў родным сваім людзе
Куточак бацькаў прывітаю
І радасць жыцця там пазнаю».

Той час прыйшоў праз дзесяцігоддзі... Не дзіва, што Колас адным з першых вітаў Дзень яднання, і рабіў ён гэта на першай паласе газеты «Звязда» ад 19 верасня 1939 года: «Браты Заходняй Беларусі! Я хачу, каб вы пачулі мой голас і словы мае, што ідуць ад шчырага сэрца. Больш дваццаці гадоў нас разлучала граніца, рассекшы на дзве часткі жывое цела народа, яго зямлю... З акна вагона бачыў я тыя мясціны, па якіх ужо даўно тысячы разоў хадзілі мае ногі. Пачуццё горычы сціскала мне сэрца, калі пазіраў я на вузенькія палоскі, на ўбогія хаты, на прыбітыя горам невясёлыя постаці маіх братоў. Нярадасныя, даўно забытыя перажыванні паўставалі зноў. Я напісаў тады вам прысвячэнне «З дарогі», якое быць можа да вас і не дайшло.

Па сходзе многіх дзён
Я зноў зірнуў у вочы родным долам —
Зняменне, ціш і сон,
Убожства і прыгон.
За крыжам крыж, астрогі ды касцёлы...
Дзе ж посулы паноў,
Іх лёкаяў аб роўнасці, аб волі?
У дзвэнканні званоў,
У звоне кайданоў,
У свісце бізуноў,
У голадзе, асадніцтве, падполлі.

Браты! Адбыўся суд гісторыі. Жудасным акордам трывогі, слёз, пакуты, знішчэння і смерці канчаецца панскае панаванне».

Але «Звязда», хоць і не было тады такіх аператыўных сродкаў сувязі, як сёння, яшчэ і ў папярэднім нумары, за 18 верасня 1939 года, адгукнулася на гарачыя падзеі. Нумар выйшаў пад лозунгам «Ніякія межы, ніякія пагранічныя слупы больш не падзеляць, не пасякуць на часці нашу родную зямельку-Беларусь». На першай паласе — верш Петруся Броўкі «Заходнім беларусам»:

«Палілі вас агнём, знішчалі вас мячом,
Не смелі гаварыць вы моваю сваёй,
Вы плакалі крывёй пад панскім бізуном,
За вас хварэлі мы і сэрцам і душой».

«АЖ ДВАЦЦАЦЬ ГОД РЫДАЛА ГОРКА МАЦІ»

Але самым насычаным творамі пісьменнікаў і паэтаў стаў тэматычны нумар «Звязды» за 19 верасня. Акрамя Якуба Коласа, на тэму з'яднання Беларусі выказаліся іншыя вядомыя дзеячы культуры. Пятро Глебка друкуе верш «Родным братам»:

«Родны брат мой, таварыш гаротны,
Сонца праўды і волю вітай,
Станавіся ў шарэнгі свабодных
Будаваць свой разбураны край!»

Верш Анатоля Астрэйкі называецца «Сустрэча», ён апісвае, як пасля вызвалення Заходняй Беларусі сустрэліся маці і сын, якія апынуліся па розныя бакі мяжы:

«Аж дваццаць год не бачыўся Васіль,
Аж дваццаць год рыдала горка маці.
І ў сэрцы не хапала болей сіл,
І слоў было ёй мала для прыняцця;
Мяжа, несправядлівая мяжа
На часткі дзве разрэзала краіну.

Вунь там палі шырокія ляжаць
Радзімы нашай, дарагой, адзінай.
А ў месца роднае не пойдзеш ты,
На ўзмежку пан праклятy круціць вусы.
Калючым дротам сплецены кусты
І ланцугамі скуты рукі беларуса».

У «Звяздзе» за 21 верасня 1939 года зноў выступае Пятрусь Броўка з вершам «Кліч народа»:

«Беларусь, сястра з заходу,
Чуцен кліч твайго народу,
Ты паўстала для расплаты,
З крывасмокамі — панамі,
Ліхвярамі,
Махлярамі.
...Б'еш касой, сякерай вострай,
Каб жылі бацькі і сёстры,
Каб пазбавіцца навечна
Долі горкае лапцюжнай,
Б'еш ты дружна,
Б'еш ты мужна!»

У «Звяздзе» за 22 верасня Якуб Колас друкуе свежы, напісаны 21 верасня, верш «Свайму народу»:

«На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою:
Сотні новых і ясных дарог
Рассцілае жыццё прад табою».

У тым жа нумары Змітрок Бядуля піша пра росквіт беларускай савецкай мастацкай літаратуры, «у той час як за апошнія два дзясяткі год у Заходняй Беларусі было цалкам задушана роднае слова, калі там зачыняліся беларускія школы, і нашы родныя браты былі кінуты ў жудасную цемру».

26 верасня ў «Звяздзе» выступае Эдзі Агнцвет з вершам «Вітанне сёстрам і братам»:

«На шэрым, спрытным скакуне
Памчаўся любы мой.
Ляці, ляці на радасць мне
Дарогаю прамой.
Нясі з Палесся пах травы
І гуд дняпровых вод.
Даць волю родным па крыві
Цябе паслаў народ.
Ці пры святле зялёных зор,
Ці ў чысты дзень, як май,
Сустрэнь братоў маіх, сясцёр
І руку ім падай!»

У гэтым жа нумары друкуецца шмат матэрыялаў пра вызваленую Заходнюю Беларусь: здымкі з Крычава, як мясцовыя жыхары сустракаюць Чырвоную Армію, просьба калектыву Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра аб накіраванні для абслугоўвання працоўных Заходняй Беларусі, вяртанне ў Мінск брыгады кінааператараў Саюзкінахронікі на чале з Вайняровічам, якія здымалі падзеі вызвалення.

У нумары «Звязды» за 29 верасня тэма яднання народа працягваецца. Сярод іншага — верш Анатоля Астрэйкі «Дружба», на гэты раз — пра закаханых Ігната і Галю:

«Ад той пары мінула дваццаць год.
Калі іх сэрцы сілай разлучылі
І над паловай вёскі панскі зброд
Свае павесіў пеўнявыя крыллі.
Яна жыла к рацэ —
Пад Замаргі,
А ён крыху наводдаль, з краю вёскі.
Яны ўдваіх хадзілі на лугі
Пад вечар слухаць
Нёмна шумны плёскат...
...Але спаткаў каханых чорны лёс.
І шчасце растапталі злыя людзі.
Паляк надзеі маладых атрос,
Як з дрэў апошні ліст халодны студзень.
Лягла мяжа праз вёску папярок
І мары маладых былі разбіты.
Ён трапіў за мяжу,
На польскі бок,
Яна — у край,
Кастрычнікам здабыты».

Верш заканчваецца сумна... Галя ў Савецкай Беларусі стала лётчыцай і праз дваццаць гадоў прыляцела вызваляць родныя мясціны. А Ігнат далучыўся да падпольнага змагання, трапіў у турму. І калі Галя прыляцела ў родную вёску, суседзі паведамілі, што ўчора яе каханага расстралялі.

«Схіліла Галя ў долу галаву.
На ўсходзе сонца ясна палыхала.
Сляза, што ўпала ў росную траву,
Вяскоўцам юнасць Галі прыгадала».

«ДУХ ЗАХВАТВАЕ АД РАДАСЦІ»

Зразумела, на вызваленне Заходняй Беларусі літаратары адгукаліся не толькі ў «Звяздзе». 21 верасня 1939 года выйшаў нумар органа праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і ўпраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР «Літаратура і мастацтва». Там перадрукоўваюцца ліст Якуба Коласа, вершы Пятра Глебкі «Родным братам» і Андрэя Ушакова «Заходнім беларусам», што выйшлі ў «Звяздзе» 19 верасня. Верш Алеся Жаўрука «Брату-беларусу» пачынаецца так:

«Сухімі прагнымі вачамі
Ў злавесна-мёртвай цішыні
Ты з тога берага начамі
Глядзеў на нашыя агні».

Нарыс Змітрака Бядулі «Нупрэйка» распавядае пра хлопчыка, які жыў у заходнебеларускай вёсцы каля мяжы. Калі ён спрабуе пераплысці на той бераг, яго забіваюць камянямі пан. Калгаснікі з савецкага берага робяцца сведкамі злачынства, і дзед Нупрэйкі, які жыве ў калгасе «Чырвоная варта», гнеўна крычыць пану:

«— Мы яшчэ прыдзем да вас і заплацім панам за ўсе крыўды!

Стары Пранук дажыў да гэтага шчаслівага часу».

З кастрычніка ў «ЛіМе» перадрукоўваецца верш Якуба Коласа «Свайму народу», а таксама змешчаны ліст Кандрата Крапівы з Ліды з загалоўкам «Дух захватвае ад радасці»: «Сяляне і рабочыя Заходняй Беларусі вельмі рады нашаму прыходу. Яны нам актыўна дапамагаюць і ахвотна расказваюць, дзе хаваюцца польскія банды. Затое панам, фабрыкантам, польскім афіцэрам наш прыход вельмі не да смаку».

У тым жа нумары віталі з'яднанне прадстаўнікі заходнебеларускай літаратуры: «Голас ваш у нашыя падзямеллі не даходзіў, і мы былі кінуты на волю лёсу. Але мы не палі і вобмацкам ішлі наперад у барацьбе за жыццё і навуку. Мы не кончылі ніводнае школы, мы не мелі права друкавацца. Мы былі прыдушаны». Паэтычна падмацоўвае зварот верш Анатоля Іверса «Вітаем музыку волі». Там жа змешчаны і самадзейны твор сялянкі з вёскі Жукавы Барок Стаўбцоўскага павета Ніны Крамко, у якім гаворыцца, як «за родную мову жандары збівалі». А яшчэ у артыкуле «Вызваленае слова» Яфіма Садоўскага распавядаецца, як аўтару паказалі ў Слоніме камеру катаванняў дэфензівы, якую «не абмінуў ні адзін з працоўных беларусаў, калі ён любіў свой народ, яго культуру і яго мову і гаварыў на гэтай мове... Калі паліцыя даведвалася, што ў пэўнай вёсцы нехта пачаў пісаць на беларускай мове і нават адважыўся прачытаць свае вершы сярод сваіх таварышаў, над «вінаватым» навісала пагроза кары, турмы, ссылкі. Яго на дзень ці на два запрашалі ў камеры катавання «пагутарыць». Гэта было законам».

У «ЛіМе» ад 3 кастрычніка 1939 года можна пачытаць верш Анатоля Астрэйкі «Прымі вітанне!» і верш Пімена Панчанкі «Парабак»:

«Ён верыў — прыдуць на падмогу
З савецкае зямлі браты,
Каб радасную перамогу
Сустрэць пад сонцам залатым».

Падзеям 17 верасня былі прысвечаны і вершы яўрэйскага паэта Зямы Цялесіна ў перакладзе Антона Бялевіча:

«Ні хлеба, ні солі,
ні к страве закрас, —
Да ніткі апошняй
разграбілі вас...
А хлеба і солі і мірны спакой,
Чырвонае войска
прынесла з сабой».

Тэма працягваецца і ў наступным нумары, які выйшаў 13 кастрычніка. Там друкуецца верш Пімена Панчанкі «Вызваленаму брату»:

«Вольны брат, засявай палі,
Насыпай буйным зернем засек,
Мы прагналі з тваёй зямлі
Каўтуновае гора навек!»

«УВЕСЬ ЧАС МЫ ВУЧЫЛІСЯ НА ПОЛЬСКАЙ МОВЕ»

Вераснёўскі нумар 1939 года дзіцячага часопіса «Іскры Ільіча» выходзіць з вокладкай, на якой намаляваная радасная сустрэча Чырвонай Арміі з вызваленымі заходнебеларускімі сялянамі. У цэнтры кампазіцыі савецкі танкіст, такім чынам малюнак чымсці нагадвае знакамітую карціну Волкава, прысвечаную вызваленню Мінска. Друкуецца «Прывітанне вызваленым братам». А ў кастрычніцкім нумары — верш Янкі Купалы «Слава табе, армія!»

«За лясы шумлівыя,
За лугі зялёныя
Слава табе, армія,
Армія Чырвоная!
З-пад няволі панскае
Беларусь Заходнюю
Вывела ты, армія,
На шляхі свабодныя».

Школьнікі з Заходняй Беларусі, вучні 4 класа Раёўскай школы, пішуць мінскім школьнікам:

«Увесь час мы вучыліся на польскай мове, таму пісаць па-беларуску не можам... Нас вельмі радуе, што не будзем больш вывучаць гісторыю польскіх каралёў. Нам хочацца хутчэй валодаць сваёй роднай мовай. Але бяда ў тым, што ў нас яшчэ няма падручнікаў на беларускай і рускай мовах».

Тут жа надрукаваны і адказ вучняў 25-й школы г. Мінска, якія гатовыя дапамагчы з навучальнымі дапаможнікамі: «Цяпер вы будзеце жыць таксама шчасліва, як жывём мы — дзеці Савецкай краіны».

Друкуецца ў перакладзе апавяданне рускага пісьменніка Мікалая Вірты «Іншакраінка» пра дзяўчынку Асю з Заходняй Беларусі, якая калісьці перайшла праз мяжу, каб паглядзець на савецкі трактар, была аблашчаная, пабывала ў савецкім дзіцячым садку, але небараку адправілі дадому. Пасля вызвалення Ася дзівіцца — як гэта можна пераходзіць праз ручай, дзе праходзіла мяжа? Апавяданне заканваецца тым, што Ася сустракаецца з сябрамі з савецкага боку і радасна кажа: «Я цяпер не іншакраінка».

Далучыўся да святкавання Дня яднання і часопіс «Работніца і калгасніца». Сярод іншага ў кастрычніцкім нумары друкуецца «Палкае прывітанне жанчынам вызваленай зямлі», рэпартаж Яфіма Садоўскага пра жыццё жанчын у Заходняй Беларусі да вызвалення.

Шматлікасць твораў на тэму з'яднання не дзівіць — падзеі 17 верасня закранулі ўсіх. Ужо 4 кастрычніка 1939 г. у друкарню была здадзена кніга «Вызваленым братам» — яе склалі творы 23 аўтараў. І няма сумневу, што тэма гэтая будзе асэнсоўвацца ў мастацкіх творах яшчэ доўга.

Падрыхтавала
Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

Разам

ВЫШЫВАНКІ XIX СТАГОДДЗЯ І НАЙЛЕПШЫ АЛІЎКАВЫ АЛЕЙ

Чым здзіўлялі на адкрыцці Фестывалю нацыянальных культур

Верхні горад Мінска цудоўным цёплым восеньскім днём прымаў прадстаўнікоў 24 нацыянальнасцяў. У сэрцы краіны адкрыўся XIV Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. Праходзіць ён будзе да чэрвеня наступнага года і завершыцца заключнымі мерапрыемствамі ў Гродне. Мяркуецца, што фінал стане яшчэ больш маштабным: культуру сваіх народаў прадставяць некалькі дзясяткаў нацыянальнасцяў, адзначыла БелТА.

Фота БЕЛТА.

Выставачныя экспазіцыі нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў не пуставалі. Паток цікаўных мінчан не спыняўся ўвесь дзень. Адны слухалі народныя песні і глядзелі аўтэнтычныя танцы, другія каштавалі нацыянальныя стравы, трэція прымярялі нацыянальныя касцюмы і спрабавалі напісаць сваё імя на розных мовах.

«Мы адкрываем фестываль нацыянальных культур. Гэтае свята сімвалізуе, што нашу любімую сінявокую краіну любяць не толькі беларусы, але ўсе, для каго яна адкрывае вялікія магчымасці незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці», — адзначыў **міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ**.

Паводле яго слоў, сёння ў Беларусі жывуць людзі розных нацыянальнасцяў адзінай дружнай сям'ёй. Сваёй стваральнай працай яны ўмацоўваюць суверэнітэт і незалежнасць нашай краіны. І кожны, хто прыязджае сюды з дабром, можа адпачыць і знайсці заняткі па інтарэсах.

Міністр падкрэсліў, што фестываль — вельмі важная пляцоўка для таго, каб калектывы, выканаўцы, мастакі маглі прадэманстраваць сваё майстэрства. Ён упэўнены, што прысутныя на фестывалі атрымаюць сапраўднае задавальненне ад іх выступленняў.

Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК падкрэсліў, што менавіта мір і згода — сімвал рэспубліканскага фестывалю і адначасова брэнд Беларусі. «На працягу многіх стагоддзяў фарміравалася самасвядомасць беларускага народа — прымаць прыязна ўсіх, хто прыехаў на гэтую зямлю. Людзі ўцякалі ад вайны, катастроф, людзі ажаніліся, стваралі сям'і. І ўсе знаходзілі ўтульнасць на нашай зямлі», — заўважыў ён.

І сёння беларускім заканадаўствам замацаваны роўныя правы — палітычныя, сацыяльныя, эканамічныя — для ўсіх, хто пражывае ў Беларусі, падкрэсліў Аляксандр Румак. «Кожны чалавек роўны ў нашай краіне. І дзякуючы сваім намаганням ён можа пабудаваць прафесійную кар'еру і сваё жыццё. Дзяржава вельмі шмат робіць, каб прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў маглі данесці сваю культуру», — дадаў ён.

Намеснік старшыні Мінгарвыканкама Арцём ЦУРАН адзначыў, што фестываль праходзіць на шырока вядомай пляцоўцы, дзе ладзяцца музычныя вечары на працягу ўсяго музычнага сезона пачынаючы з мая. «Такім прыгожым фінальным акордам завяршаем наш музычны турыстычны сезон. Словы ўдзячнасці прадстаўнікам дыяспар, якія дэманструюць сваю творчасць. Упэўнены, што ўсе атрымаюць толькі станоўчыя эмоцыі ад свята», — перакананы намеснік старшыні Мінгарвыканкама.

Пасля афіцыйных прамоў канцэртная праграма свята працягнулася самабытнымі нумарамі. І кожны сустракалі бурнымі авацыямі. На сцэне музычная культура прадстаўнікоў азербайджанскай, аргенцінскай, армянскай, афганскай, башкірскай, грэчаскай, грузінскай, дагестанскай, яўрэйскай, кітайскай, карэйскай, малдаўскай, нямецкай, палесцінскай, пакістанскай, польскай, рому, рускай, татарскай, туркменскай, украінскай, чувашскай і эстонскай культур.

«Здзівіць мінчан немагчыма — мінчане самі здзіўляюць», — заўважыў **былы старшыня палесцінскай абшчыны ў Беларусі Хасан Камаль МАХМУД**.

Выставачная экспазіцыя Палесціны прыцягнула сваім каларытам. Чэргі да яе не заканчваліся. «Мы здзіўляем нашай культурай і асабліва кухняй. Вось музычныя інструменты, розныя ручныя вырабы з аліўкавага дрэва, у тым ліку карта Палесціны, вырабы з марскіх ракаў», — паказаў ён.

Тут можна было пачаставацца сапраўдным, найлепшым аліўкавым алеем, прывезеным непасрэдна з Палесціны. Яго прапаноўвалі пакаштаваць з белым хлебам і затарам — прыправай, якая атрымала сваю назву ад расліны, што з'яўляецца галоўным яе інгрэдыентам.

Непадалёк размясцілася экспазіцыя Саюза палякаў у Беларусі. Па словах **старшыні грамадскага аб'яднання Аляксандра СОНГІНА**, распавесці аб польскай нацыянальнай культуры і паказаць яе шматграннасць за адзін дзень немагчыма, таму тут толькі яе асобныя элементы. Зрэшты, польская культура сугучная з беларускай, заўважыў ён.

Народным малдаўскім гумарам і сумам дзяліўся на сцэне Верхняга горада гурт «Плай» (у перакладзе з малдаўскага — «край»). **Старшыня рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Суполка малдаван» Антаніна ВАЛЬКО** раскрыла сэнс некаторых выкананых народных песень. А наогул група «Плай» на сцэнах краіны і за мяжой больш за 25 гадоў. «Мы стараемся паказаць культуру народа, да якога мы належым. А народ у нас вельмі прыгожы, тэмпераментны, заўсёды спявае песні — і ў горы, і ў радасці. Ёсць песні для сцэны, для весялосці, для суму. Рэпертуар нашай групы гадзіны на тры. Мы ўсё лета ў раз'ездах: ездзілі на вішнёвы фестываль у Глыбокае, у Моталь, дзе выступілі на дзвюх пляцоўках. Вярнуліся вельмі задаволеныя», — сказала Антаніна Валько.

Напрыканцы яна прызналася: «Вельмі люблю кіраўніка нашай дзяржавы. Я і песню яму прысвяціла. А чаму не? Бо ён заслужыў нашу любоў», — прызналася старшыня рэспубліканскай грамадскай арганізацыі.

Больш за сотню работ-вышыванак прадставіла дыяспара ўкраінцаў. Адна з самых ранніх датуецца 1885 годам. «Гэтыя работы засталіся ад бабуль, і мы іх захоўваем. Раней вышывалі рабілі на канапляным палатне, таму што набыць іншы матэрыял было вельмі дорага. Акрамя таго, у нас ёсць работы майстроў, якія і сёння вышываюць», — распавяла **старшыня Мінскага гарадскога грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Заповіт» Галіна КАЛЮЖНАЯ**.

Увогуле, старт фестывалю стаў яркім. Беларусы з нецярпеннем будуць чакаць заключных маштабных мерапрыемстваў летам наступнага года ў Гродне: шэсце, вялікая канцэртная праграма, якая будзе трансляваца па тэлебачанні, у другі дзень — работа падворкаў. Усе атрыбуты — нацыянальныя касцюмы, творчасць, кухня — там будуць прадстаўлены значна шырэй, заўважыла **мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Алена ГОСЦЕВА**.

«Людзі розных нацыянальнасцяў жадаюць, каб часцінка іх радзімы заваявала беларусаў, іх каларыт дапоўніў нашу рэспубліку, — адзначыла **начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Ірына КАРПОВІЧ**. — А мы паказваем, што Беларусь — гасцінная, добразычлівая краіна для жыцця прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцяў, якія прыходзяць сюды з дабром».

КНІГА ЯК ВОІН-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТ

У 1987 годзе і ў ЦК Кампартыі Беларусі, і ў Дзяржаўным камітэце па друку рыхтаваліся да 70-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Несумненна, новых творчых здзяйсненняў, якія ўслаўлялі б савецкі лад жыцця, чакалі і ад пісьменнікаў... Мо і такіх, якія гучалі б на ўсю моц мастацкага таленту, як некалі гучала рэвалюцыйна-паэтычная стылістыка ў вершах народнага песняра Беларусі Янкі Купалы: «Ад вас, Кастрычніка сыны, / Ад вашых сэрцаў пралетарскіх, / Як ніва сонечнай вясны, / Чакаюць песень — а бунтарскіх — / Заводаў гулкія гудкі, / Калгасны працавіты трактар, / Чырвонай Арміі штыкі / І пагранічаў нашых варта» («Маладым паэтам»)... Гэты «пафасны зварот», як вызначыў верш літаратуразнаўца, паэтазнаўца Варлен Бечык у артыкуле ў энцыклапедыі «Янка Купала», быў напісаны 16 лістапада 1931 года. Праз 14 гадоў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі... А з чым жа падыходзілі наступнікі пісьменнікаў 1920—1930-х гадоў, кнігавыдаўцы БССР да юбілейнай кастрычніцкай даты ў 1987 годзе?..

Некаторыя дэталі і не толькі дэталі, некаторыя тагачасныя тэндэнцыі, характарыстыкі літаратурнага, кнігавыдавецкага працэсу — у дакладной запісцы старшыні Дзяржкамдруку БССР Міхаіла Дзяльца «Пра выпуск літаратуры па інтэрнацыянальнаму выхаванню, літаратуры народаў СССР і ўзаемным кнігаабмене паміж саюзнымі рэспублікамі», якую тагачасны «кніжны міністр» адрасаваў аддзелу прапаганды і агітацыі ЦК КП Беларусі. Запіска, якая і сёння захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, датаваная 19 студзеня 1987 года.

«За перыяд з 1981 па 1986 год рэспубліканскімі выдавецтвамі выпушчаны цэлы шэраг выданняў па інтэрнацыянальнаму, патрыятычнаму выхаванню», — пачынае свой даклад старшыня. І далей прыводзіць канкрэтныя факты. У 1982 годзе ў выдавецтве «Беларусь» убачылі свет зборнік «Пабрацімы Матросава» і кніга К. Т. Мазурава «Незабыўнае»...

Энцыклапедычная даведка. Кірыл Трафімавіч Мазураў (1914 — 1989) — савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, Герой Сацыялістычнай Працы. Першы намеснік старшыні Савета Міністраў СССР (1965 — 1978). Член Палітбюро (Прэзідыума) ЦК КПСС (1965 — 1978; у 1957 — 1965 — кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПСС), член ЦК КПСС (1956 — 1981). Нарадзіўся ў Рудні-Прыбыткоўскай Гомельскага павета ў сялянскай сям'і. У час Вялікай Айчыннай вайны — сакратар падпольнага ЦК ЛКСМ Беларусі, другі сакратар ЦК ЛКСМБ, у 1944 — 1947 — першы сакратар ЦК камсамола Беларусі. У 1953 — 1956 — Старшыня Савета Міністраў Беларускай ССР. У 1956 — 1965 — першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі. Кніга ўспамінаў Кірылы Трафімавіча «Незабыўнае» ў 1987 годзе ўбачыла свет другі раз, першае выданне было здзейснена ў 1984 годзе. Шкада, што беларускія выдавецтвы не выдалі ўспамінаў іншых першых асоб рэспублікі ці нават проста высокіх кіраўнікоў Беларусі. Напрыклад, Міхаіла Васілевіча Зімяніна. Ці — Мікалая Сямёнавіча Патолічава...

З перадюбілейнай дакладной запіскі М. Дзяльца: «... у 1983 — 1985 гг. выдадзены трохтомны зборнік «Усенародная барацьба ў Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны», зборнік «Патрыятычнае выхаванне працоўных» (1985 г.), кніга А. Капусціна «Радзіма — любоў наша вечная» (1986 г.), якая выйшла ва ўсесаюзнай міжвыдавецкай серыі «СССР — братэрства народаў». Выдавецтва «Народная асвета», напрыклад, выдала для навучэнцаў сярэдніх школ і ПТВ кнігу Ю. Афоніна «Разам да адзінай мэты» (1985), кнігу І. Семычкіна « У братэрскім саюзе» (1982 г.). Цэлы шэраг кніг указанай тэматыкі штогод выходзяць у выдавецкіх серыях выдавецтва «Мастацкая літаратура»: «Проза народаў СССР» і «Паэзія народаў СССР», у серыях выдавецтва «Юнацтва»: «Любіце Радзіму, ганарыцеся ёю», «Слава твая, Беларусь», «Я другой такой краіны не ведаю», «Карчагінцы васьмідзесятых» і іншыя».

М. І. Дзялец адзначае, што за ўказаны перыяд рэспубліканскімі выдавецтвамі выпушчана даволі шмат кніг інтэрнацыянальнага, патрыятычнага гучання. У 1981 годзе — 126 назваў. У 1982-м — 120 назваў, 1983-м — 137, 1984-м — 152, 1985-м — 160, 1986-м — 161 назва.

Без усякіх каментарыяў асабліва хацелася б працытаваць наступны справаздачны радок з запіскі «кніжнага міністра»: «...Развіццю міжнацыянальных адносін садзейнічае выпуск такіх выданняў, як «Русско-белорусский словарь» у 2-х тамах («БелСЭ», 1982), рыхтуецца да друку «Русско-белорусский словарь» («БелСЭ»), а таксама такіх выданняў выдавецтва «Навука і тэхніка», як «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» (Выпуск 1–17), «Этымалагічны слоўнік беларускай мовы» (тамы 1–4), «Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча» ў 5-ці тамах, «Тураўскі слоўнік» (тамы 1–3) і іншыя.». Магчыма, гэты абзац — і з-за таго, што іншай фактуры не так і шмат. Але хацелася б думаць іначай: слоўнікавы запас, наяўнасць у краіне перакладных і тлумачальных слоўнікаў, іншых выданняў такой лінейкі з'яўляўся, на думку кіраўніцтва органа дзяржаўнага кіравання і саміх арганізатараў выдавецкай практыкі, стратэгічным кірункам, які сведчыў не толькі пра высокі ўзровень кніжнай культуры, але і пра магчымасць выкарыстоўвання такой літаратуры ў інтэрнацыянальным, патрыятычным выхаванні грамадства. Такая акалічнасць, пагадзіцеся, мае сваю асабліву вагу.

З даведкі М. Дзяльца: «Выпуск твораў літаратуры народаў СССР сканцэнтраваны ў асноўным у выдавецтве «Мастацкая літаратура» і на дадзены момант складае прыкладна 15 працэнтаў ад усяго аб'ёму кніжнай прадукцыі, якая выпускаецца. Калі ў 1981 годзе было выпушчана 11 кніг пісьменнікаў братэрскіх рэспублік агульным тыражом 304 тысячы экз., то ў 1986 годзе — 26 кніг агульным тыражом 2916 тысяч экз. За гады адзінаццатай пяцігодкі былі выпушчаны кнігі ў перакладзе на беларускую мову з 15 нацыянальных моў. На дванаццатую пяцігодку запланаваны выпуск твораў болей 60 аўтараў з 27 нацыянальных моў.

У першую чаргу выдаюцца творы, якія адзначаны прэміямі — Ленінскай і дзяржаўнымі. Шырока прадстаўлены творы пісьменнікаў народаў СССР у серыях «Проза народаў СССР», «Паэзія народаў СССР», штогодніку «Братэрства».

Беларускі чытач пазнаёміўся з творамі рускіх пісьменнікаў (С. Ясеніна, Ф. Цютчава, У. Маякоўскага, А. Твардоўскага, Г. Ахматавай, Л. Лявонава, К. Федзіна, Б. Ахмадулінай, Г. Маркава, С. Залыгіна, С. Шчыпачова, У. Салаухіна і інш.; пісьменнікаў Літвы (Э. Межэлайціса, М. Чурлёніса, М. Мартынайціса, В. Бубніса, К. Данелайціса); Украіны (Т. Шаўчэнкі, В. Элана, М. Рыльскага, А. Ганчара, Г. Цюцюнніка, М. Алейніка, М. Нагнібяды, І. Вільдэ); Эстоніі (Л. Метсара, Ю. Туліка, А. Сійга), Кыргізіі (Ч. Айтматава, М. Мурталіева, А. Айтымбетава), Малдавіі (Г. Віеру), пісьменнікаў Туркменіі, Казахстана і іншых саюзных рэспублік.



Акрамя асобных выданняў і публікацый у штогоднік «Братэрства» выдавецтва ажыццяўляе выпуск анталогій паэзіі і прозы братэрскіх літаратур. Выйшлі ў свет двухтомныя анталогіі ўкраінскай і літоўскай паэзіі, выдадзена двухтомная анталогія латышскай паэзіі, зборнік апавяданняў таджыкскіх пісьменнікаў «Дом для крыніцы». У дванаццатай пяцігодцы плануецца выпуск двухтомных анталогій грузінскай паэзіі, малдаўскай паэзіі, рускага апавядання, выйдуць у свет <зборнік> узбекскай аповесці «Другі перавал», зборнік літоўскай навэлы, зборнік чувашскай паэзіі «Песні волжскага края» і інш.

План выпуску літаратуры народаў СССР на 1987 — 1990 гг. уключае больш, у 90 назваў кніг — твораў класічнай і сучаснай літаратуры. Асаблівая ўвага надаецца выпуску твораў класічнай літаратуры — А. Пушкіна, Л. Талстога, А. Грыбаедава, І. Тургенева, А. Чэхава, С. Цютчава, Ф. Дастаеўскага, А. Хаяма, А. Наваі і інш.»

Але каб ажыццявіць здзяйсненне гэтых абсягаў, патрэбен быў атрад уніклівых перакладчыкаў. У той час актыўнасці свае ў дадзеным рэчышчы выяўлялі народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль, паэты Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, празаікі Барыс Сачанка, Алесь Жук, Вячаслаў Адамчык, Ян Скрыган, Анатоль Кудравец, Іван Пташнікаў і шмат хто яшчэ. Арыгінальныя творцы, яны не шкадавалі часу на складаны занятак. Праца ў галіне мастацкага перакладу дастойна аплачвалася, што таксама адыгрывала пэўную ролю. Ды і не заўсёды натхненне скіроўвала на плённую работу над арыгінальнымі творамі. Так што пісьменнікі з задавальненнем аддавалі час перакладу... Зазірнём у біябібліяграфічны даведнік «Беларускія пісьменнікі»... Толькі ў 1980-я гг. Рыгор Барадулін выдаў ім адным перакладзеныя наступныя кнігі: «Небам адзіным» Андрэя Вазнясенскага (1980), «Мелодыю каліны» Івана Драча, «Слон купіў веласіпед» Івана Бурсава (1984), два зборнікі перакладаў паэзіі розных народаў — «Кахаць — гэта значыць...» (1986), «Беларусь — маё слова і песня» (1988)... А яшчэ за дзесяцігоддзе паспеў надрукаваць у перыёдыцы пераклад твораў Е. Букава, Х. Берулавы, А. Такамбаева, К. Маліква, А. Султанава, Дж. Алыбаева, Г. Каландзія, Я. Хелемскага, Ф. Садыга, Б. Акуджавы, Назармата, С. Гарадзецкага, М. Турсун-Задэ, Махтумкулі, Я. Смелякова, Е.Стулпаніса, І. Зіедоніса... Пералік можа аказацца надзіва доўгім. Я. Брыль пераклаў у 1980-ягг. апавяданні Уладзіміра Салаухіна (у 1984 годзе выйшла на беларускай мове кніга прозы гэтага яркага рускага пісьменніка «Пад адным дахам»). У 1982 г. выйшаў раман узбекскага пісьменніка Н. Сафарава «Дні праклёну і дні надзеі» ў перакладзе Алеся Жука, у 1984-м — у яго ж перакладзе раман туркменскага празаіка Тыркіша Джумагельдыева «Прапашчы чалавек». Для альманаха «Братэрства» Алесь Жук пераклаў апавяданні туркменскіх літаратараў Атаджана Тагана, Алаберды Хаідава, а ў 1981-м — аповесць Уладзіміра Багамолава «Зося»...

З даведкі М. Дзяльца: «Значнае месца займаюць творы літаратуры народаў СССР у тэматычных планах выдавецтва «Юнацтва». Калі ў 1981 годзе для дзяцей і юнацтва было выдадзена 24 кнігі пісьменнікаў братэрскіх рэспублік на беларускай і рускай мовах агульным накладам 3 886, 2 тысячы экз., то ў 1986 годзе — 38 кніг агульным тыражом 6 090 тысяч экзэмпляраў.

Пры фарміраванні планаў выпуску літаратуры народаў СССР выдавецтва кіруецца рэкамендацыйнымі спісамі Дзяржкамвыдата СССР, Саюза пісьменнікаў СССР, рэкамендацыямі Саюза пісьменнікаў БССР. Як правіла, выдаюцца перш за ўсё кнігі пісьменнікаў, якія адзначаны нацыянальнымі і дзяржаўнымі прэміямі.

Перспектыўныя планы выпуску складаюцца з уліка ахопу літаратуры ўсіх саюзных рэспублік. Дыяпазон іх пашыраецца. Так, калі за гады адзінаццатай пяцігодкі былі выпушчаны творы ў перакладзе з 10 моў народаў СССР, то на XII пяцігодку запланаваны выпуск твораў у перакладзе з 19 моў народаў СССР.

Адным з першых у краіне выдавецтва «Юнацтва» пачало выпуск кніжнай серыі «Бібліятэка дзіцячай літаратуры народаў СССР» — 15-томнага

ўнікальнага выдання (для параўнання: у сённяшнім Узбекістане запланавана да выпуску 200-томная Бібліятэка сусветнай дзіцячай літаратуры. — **Аўт.**), сарыентаванага на дзяцей малодшага школьнага ўзросту, закліканага пазнаёміць чытача з лепшымі творамі класікі і сучаснай літаратуры братэрскіх рэспублік. З 1983 года выйшла сем тамоў Бібліятэкі: зборнік беларускай літаратуры для дзяцей «Вясянка», украінскай — «Ад круч дняпроўскіх», літоўскай — «Бурштынавыя каралі», узбекскай — «Вясёлка над арыкам», грузінскай — «Дружная з сонцам», малдаўскай — «Гронкі радасці», латышскай — «Песні Даўгавы». Да канца XII пяцігодкі выдавецтва плануе завяршыць выпуск гэтай серыі. Усе тамы Бібліятэкі дзіцячай літаратуры народаў СССР складаюцца і зацвярджаюцца у Саюзе пісьменнікаў той ці іншай краіны.

<...>

У 1986 годзе выдавецтва выпусціла першы штогадовы альманах «Ветразь», у якім прадстаўлены творы для дзяцей і юнацтва літаратараў братэрскіх рэспублік і замежных краін.

Да перакладчыцкай дзейнасці выдавецтва прыцягвае вопытных прафесійных літаратараў — Я. Брыля, Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, І. Бурсава, В. Сёмуху і інш.»

Але ж, відавочна, увага чытача, пакупніка кнігі да перакладной літаратуры на беларускай мове не такога маштабу, як увага да арыгінальнай беларускай... Як складвалася яе гандлёвае распаўсюджванне? Як увогуле сістэма кнігагандлю была задзейнічана ў інтэрнацыянальным выхаванні пакупніка кнігі?.. «У дадзены момант, — дакладваў «кніжны міністр» у ЦК КПБ, — адпрацавана сістэма абмену кніжнай прадукцыяй, якая выпускаецца рэспубліканскімі выдавецтвамі, паміж кнігагандлёвымі арганізацыямі краіны. Яна дазваляе пазнаёміць насельніцтва з дасягненнямі навукі, тэхнікі, перадавога вопыту братэрскіх рэспублік, развіццём іх нацыянальнай літаратуры, культуры і мастацтва, пазнаёміць чытачоў з гісторыяй і падзеямі сучаснага жыцця народаў СССР.

З гэтымі мэтамі ў Мінску і іншых гарадах краіны адкрыты спецыялізаваныя кніжныя крамы, якія распаўсюджваюць выданні народаў СССР. Гэтыя крамы сталі не толькі цэнтрамі прапаганды кніг нацыянальных аўтараў, — ў першую чаргу імі праводзіцца праца па вывучэнні попыту насельніцтва на рэспубліканскія выданні і абмене вопытам распаўсюджвання гэтых кніг.

Для шырокай прапаганды і распаўсюджвання лепшых твораў шматнацыянальнай літаратуры народаў СССР на рускай і нацыянальных мовах кнігагандлёвыя арганізацыі рэспублікі рэгулярна ўдзельнічаюць ва ўсесаюзных аптова-рознічных кніжных кірмашах, якія дазваляюць ажыццявіць абмен кнігамі паміж рэспублікамі. Толькі на апошнім Усесаюзным кірмашы ў г. Баку было прададзена кніг беларускіх аўтараў кнігагандлям краіны на суму болей 1, 5 млн. рублёў. Акрамя Усесаюзных кірмашоў Упраўленне кніжнага гандлю і аблкнігагандлі рэспублікі сістэмна прымаюць удзел у міжрэспубліканскіх і рэспубліканскіх кірмашах...

Пастаянны абмен выпушчанымі выданнямі ажыццяўляецца намі з прыбалтыйскімі рэспублікамі. Прапагандай і распаўсюджваннем кніг літоўскіх выдавецтваў займаецца ў Мінску крама «Вільнюс», а беларускіх выданняў у Вільнюсе крама «Мінск». Традыцыйнымі ў Мінску сталі выстаўкі-продажы кніг выдавецтваў Літвы, правядзенне кожнай восенню тыдняў літоўскай кнігі. Падобныя формы выкарыстоўваюцца і літоўскімі кніжнікамі для прапаганды беларускай кнігі ў сябе ў рэспубліцы. Толькі ў 1986 годзе праведзены выстаўкі беларускай кнігі ў Ташкенце, Душанбэ, Таліне.

У выніку пералічаных мерапрыемстваў рэалізацыя кніг беларускіх выдавецтваў кнігагандлёвым арганізацыям краіны дасягнула 1, 5 млн рублёў штогод.

Асаблівая ўвага надаецца пастаўкам выданняў, якія выходзяць у рэспубліцы, кнігагандлям Сібіры і Далёкага Усходу, якія абслугоўваюць зону Байкала-Амурскай магістралі. За XI пяцігодку і 1986 год ім адпраўлена кніг беларускіх паэтаў і празаікаў, выданняў пра Беларусь, яе гісторыю, культуру, мастацтва на суму 300,0 тысячы рублёў.

З года ў год павялічваецца продаж беларускай кнігі насельніцтву краіны праз крамы і аддзелы «Кніга — поштай». Штогод каля пяцісот тысяч бандэроляў адпраўляюцца накладзеным плацяжом у розныя адрасы Савецкага Саюза, а іх таваразварот складае болей 2,0 млн. рублёў у год. Улічваючы рост зацікаўленасці чытачоў краіны да беларускай кнігі, цалкам забяспечваецца выкананне заявак пакупнікоў з-за межаў рэспублікі на выданні грамадска-палітычнай і навукова-тэхнічнай тэматыкі, беларускай класічнай і сучаснай літаратуры».

І як выснова: «У далейшым Дзяржкамвыдат БССР будзе надаваць пастаянную ўвагу развіццю абмена выданнямі з другімі рэспублікамі краіны і ўдасканаленню форм і метадаў іх прапаганды і распаўсюджванню, што, безумоўна, паслужыць узаемнаму ўзбагачэнню народаў СССР і ўмацаванню міжнацыянальных сувязяў».

Кніга, у тым ліку і мастацкая, была на службе выхавання грамадства, спрыяла ўмацаванню дружбы паміж народамі з рознымі нацыянальнымі характарамі, на крайні выпадак — дазваляла спасцігнуць, зразумець гэтыя характары...

Кастусь ЛЕШНІЦА.
Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
по поручению ликвидатора ОАО «ПМК-188» (222357, Минская обл., г. Воложин, ул. Пушкина, 24)
проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

№ лота	Наименование	Инв. №	Начальная цена, с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
1	Вагон-дом (кунг) на шасси от автомобильного прицепа 2ПН-2, год выпуска не установлен	12529	456,00	45,00
2	Штукатурная станция ШС-4/6, 2010 г.в.	12486	4608,00	460,00
3	Прицеп-самосвал автомобильный МАЗ-857100-010, 2008 г. в., регистрационный знак отсутствует, рама № У3М85710080000453	116738	1200,00	120,00
4	Бункер БН-1,0 СТШИ.Б-0,38.000, 2014 г. в.	116859	436,8	43,00
5	Штукатурная станция СШБ-4, 2010 г. в., на шасси прицепа ПТ-7	116788	4896,00	489,0
6	Автомобиль легковой седан ВАЗ-21074, 2008 г. в., регистрационный знак 7386 ЕР-5, кузов № ХТА21074082734306, цвет сине-зеленый	116775	427,20	42,0

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Воложин, ул. Пушкина, 24.

*Начальная цена лотов снижена на **60 %**.*

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не установлено договором купли-продажи.

Всем желающим представляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Условия аукциона: работоспособность узлов и агрегатов не проверялась, при инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества. Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 25.01.2023, 18.03.2023, 11.05.2023, 15.06.2023, 20.06.2023, 03.08.2023.

Аукцион состоится **25.09.2023 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.09.2023** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17,
телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.

УНП 600019633

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
по поручению ликвидатора ОАО «ПМК-188» (222357, Минская обл., г. Воложин, ул. Пушкина, 24)
проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

№ лота	Наименование	Начальная цена, с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
1	Автомобиль легковой седан ВАЗ-21074, 2010 г. в., рег. знак 6720 ЕР-5, кузов № ХТА210740А2940399, цвет черный	1188,00	118,00
2	Автобус-вагон пассажирский ГАЗ-322132, 2014 г. в., рег. знак АО 3490-5, кузов № Х96322132Е0781181, цвет серый	16 416,00	1 641,00
3	Станок сверлильный настольный 2Н112, 1976 г. в., заводской № 77	518,40	51,00
4	Станок обдирочно-шлифовальный ЗМ634, 1973 г. в.	313,20	31,00
5	Станок токарно-винторезный 1Е61М, 1961 г. в.	2 052,00	205,00
6	Виброрейка РВ-32 ВИ	140,40	14,00
7	Бензогенератор Shtenli 6400Pro	410,40	41,00
8	Алмазная сверлильная установка «ESSON» D-200, 2011 г. в.	583,20	58,00
9	Трубогиб ручной гидравлический «VOLL» V-Bend 2, 2012 г. в.	453,60	45,00

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Воложин, ул. Пушкина, 24.

Начальная цена снижена ***на 10 %.***

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не установлено договором купли-продажи.

Всем желающим представляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Условия аукциона: работоспособность узлов и агрегатов не проверялась, при инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от **27.07.2023**.

Аукцион состоится **25.09.2023 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.09.2023** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17,
телефон для осмотра 8 (029) 351 10 33.

УНП 600019633

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона)
по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»
(продавец, 222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б, +375(029) 351 10 33)
проводит повторный открытый электронный аукцион по продаже:

№ лота	Наименование	Инв. №	Начальная цена, с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
1	Камнеуборочная машина УКП-0,7; 1989 г. в.	5659	1332,00	133,00

Стоимость снижена на **90 %**.

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б.

Электронные торги состоятся *27 сентября 2023 года* в 11.00.

Заявления с прилагаемыми к ним документами на участие в электронных торгах принимаются не позднее *22 сентября 2023 года включительно до 17.00*". Консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются в рабочие дни с 08.30 до 13.00 и с 13.30 до 17.00.

*Подача заявления на участие в электронных торгах включает в себя аккредитацию (верификацию) на электронной торговой площадке «TORGI.RLT.BY» (далее – ЭТП).

Оператор ЭТП **в течение 2 рабочих дней со дня заполнения заявления-анкеты на аккредитацию (верификацию)** с приложением документов, предусмотренных в подпункте 2.1.5 пункта 2.1 Регламента электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY» принимает решение об аккредитации (верификации) либо отказе в аккредитации (верификации) и направляет соответствующее уведомление с использованием функциональных возможностей ЭТП и (или) электронной почты и (или) мобильного телефона, указанных при аккредитации (верификации).

Организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», адрес электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова 5, каб. 321.

Контактные телефоны: + 375 (17) 516-80-64, +375 (44) 789-10-18.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by, и Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Задатки для участия в электронных торгах перечисляются не позднее 22.09.2023 года включительно на расчетный счет № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен договором купли-продажи.

Всем желающим представляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 02.03.2022, 16.04.2022, 11.05.2022, 09.06.2022, 23.07.2022, 08.09.2022, 25.10.2022, 10.05.2023, 15.06.2023, 01.08.2023.

Условия аукциона: работоспособность узлов и агрегатов не проверялась, при инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества.

КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Паўднёвы курорт, мора і сонца... Калі выпадае беларусам убачыць тыя глянцавана-рэкламныя пейзажы, то праз наш характар, занураносць ва ўласныя рэфлексіі атрымаць асалоду шанцуе рэдка. Згадаем хаця б аповесць Алеся Жука «І сніўся сон...», герой якой на курорце аддаецца ўспамінам аб прамінулым каханні.

У гэтым сэнсе гераіня апавядання Наталлі Ніканчук нетыповая беларуска, бо выдатна ўмее атрымліваць асалоду тут і цяпер. У тым ліку — ад мужчынскай увагі.

Чытанне для адпачынку, якое дадасць крыху сонца ў чаканыя восеньскія халады. Настальгічна ўспамінаць уласныя курортныя прыгоды не забараняецца.

Наталля Ніканчук — аўтар зборніка вершаў «Любоў — крылатая істота», дэтэктыўнага рамана «Іоланта», кнігі прозы «...Кранаючы неба рукамі». Лаўрэат абласных і рэспубліканскіх літаратурных конкурсаў. Жыве і працуе ў горадзе Горкі Магілёўскай вобласці.

Алена БРАВА.

Наталля НІКАНЧУК

СТРЭЛЫ АМУРА

Апавяданне

ВОСЬ чаму так адбываецца? Жывеш сабе, жывеш, удзень ходзіш на працу, увечары мыеш посуд, прасуеш бялізну, робіш нейкія нарыхтоўкі на зіму і ўвесь час марыш пра тое, каб да цябе нарэшце даляцела хоць адна невялічкая страла Амура. А бывае наадварот: нічога такога нават у думках не трымаеш, а тут — бац, трапляеш пад сапраўдныя амурны абстрэл. Магчыма, гэта выпадковасць, збег абставін. А можа, і не...

Здарылася гэта падчас майго адпачынку ў Турцыі. На дзявятага верасня, нядзелю, было запланавана марское падарожжа на вялікім катамаране. Да порта Кемера дабіраліся аўтобусам хвілін сорак. Адразу ў вочы кінулася вялікая колькасць караблёў, што стаялі каля прыстані. Тут былі традыцыйныя турэцкія гулеты — двухмачтавыя парусныя судны, аздобленыя на сучасны лад, шыкоўныя трохмачтавыя парусныкі, яхты і лодкі розных памераў. Паруснікі ўпрыгожвала спецыфічная сімволіка — у асноўным, выявы герояў кінафільма «Піраты Карыбскага мора», асабліва часта выкарыстоўваўся вобраз знакамітага Дэйві Джонса — капітана «Лятучага Галандца». То тут, то там мільгалі выявы Джэка Вераб'я ў самых розных інтэрпрэтацыях.

Вялікі катамаран каля прыстані быў пазбаўлены такіх экзатычных упрыгожванняў і нагадваў хутчэй велічэзны плавальны сродак часоў Савецкага Саюза, чым пірацкае судна. Быў ён няўклюдны, крыху пашарпаны. Мы дачакаліся сваёй чаргі выхаду з порта, і, зрабіўшы некалькі моцных гудкоў, катамаран адправіўся ў падарожжа.

У пачатку верасня, як правіла, на турэцкім узбярэжжы добрае надвор'е. Прагрэтае сонцам паветра і такое ж цёплае Міжземнае мора прывабліваюць турыстаў з усяго свету. Сюды едуць з суседніх краін Бліжняга Усходу, з Еўропы і, вядома ж, з Расіі. Я разлічвала, што падчас падарожжа буду загараць на верхняй палубе і адначасова любавацца цудоўнымі марскімі пейзажамі. Але праз хвілін дваццаць пасля таго, як мы пакінулі порт, надвор'е сапсавалася. Пайшоў дробны дождж. Далей стала яшчэ горш, пачалі бліскаць маланкі. Не надта моцна, але пагрымвала. Прыйшлося мяняць свае планы і тэрмінова спускацца на другую палубу, дзе мела адбыцца пенная вечарына.

Мне падавалася, што гэтая забава толькі для дзяцей. Але праз некаторы час меркаванне змянілася. Адзін даволі прыемны цёмнавалосы чалавек запрасіў мяне патанцаваць, і паступова я ўвайшла ў смак.

Тут трэба патлумачыць, што я вельмі люблю танцаваць. Калі чую добрую музыку, ногі самі пускаюцца ў скокі. Так мы і бавілі час: танчылі, потым на нас паляцелі шматкі лёгкіх белых бурбалак, і амаль усе прысутныя пакрыліся пенай. Памятаю, з усіх бакоў мігцелі ліхтарыкі працуючых камер — мяне фатаграфавалі, але гэта не замінала. Я адчувала сябе свабоднай і шчаслівай.

Мой партнёр па танцах, як высветлілася, быў з Ірака. Звалі яго Ахмет. Гэта ўсё, аб чым я змагла даведацца напачатку, бо ні ён, ні я не размаўлялі на міжнароднай мове зносін, то-бок па-англійску. Яго электронны перакладчык чамусьці ўвесь час даваў збоі, а я нават і не намагалася нешта перакладаць на сваім старым мабільным тэлефоне. Ён быў у марской вандроўцы са сваімі сябрамі-іракцамі, і калі мяне прадстаўляў ім, то сказаў проста: «My friend». Потым усе, хто адпачываў на судне, пайшлі купацца, для гэтага быў зроблены прыпынак, і нам выдалі спецыяльныя плавальныя сродкі — кругі, зробленыя са шчыльнага пенапласту.

Мы з Ахметам купаліся разам у цёплай цёмна-сіняй вадзе. Звычайна празрыстая альбо светла-бірузовая вада Міжземнага мора ў гэтым месцы была як быццам пафарбавана сінькай. Размаўляла я са сваім залётнікам на мове жэстаў і мімікі. Так і даведалася, што ў яго на радзіме ёсць жонка і дзве дачкі, а тут ён адпачывае з сябрамі ў Анталіі. Калі марская вандроўка закончылася і я сышла на бераг, чамусьці не заўважыла Ахмета ў натоўпе.

Зваротны шлях прынёс новыя сюрпрызы. Да мяне пад'ехаў шыкоўны белы аўтамабіль. Даволі салідны мужчына з сівымі вусамі прапанаваў падвезці да гатэля. «А чаму б і не? Невядома, калі яшчэ будзе той запланаваны аўтобус», — падумала я.

Арыкан, так ён прадставіўся, ехаў павольна, нават вельмі павольна — відавочна, каб расцягнуць час нашага сумеснага знаходжання ў аўто. Але гэтыя хітрыкі не надта дапамаглі яму ў амурных справах. Арыкан крыху размаўляў па-рускі, і я зразумела, што ён пастаянна жыве тут, у Турцыі, і прыблізна аднаго ўзросту са мной — каля пяцідзесяці.

Гэта толькі маладым здаецца, што ў пяцьдзясят жыццё закончваецца. Скажу вам па сакрэце: у пяцьдзясят яно ніколькі не горшае, чым у сорак альбо ў трыццаць. Менавіта ў гэтым залатым узросце пачынаеш цаніць шчырасць пачуццяў, цяпло чалавечай душы.

Увесь той прамежак часу, пакуль мы ехалі з Кемера да мястэчка Бельдзібі, дзе я адпачывала, Арыкан жаліўся на свой няўдалы лёс і навешваў мне на вушы іншую локшыну. Гаварыў, як яму дрэнна жывецца, такому адзінокаму, хоць і забяспечанаму чалавеку. Закончылася яго палымяная прамова прапановай застацца тут, у Турцыі, назаўжды. «І мы будзем жыць разам, удваіх, у прыгожым доме на беразе мора».

Я не была гатова да такіх радыкальных змен у сваім жыцці, таму другая страла Амура таксама праляцела міма майго сэрца. Наадварот, я папрасіла свайго спадарожніка спыніць аўто і пайшла далей па вуліцы пешшу, тым больш што да майго гатэля было ўжо рукой падаць. Ішла паволі, разглядваючы вітрыны з жаночым адзеннем і ўпрыгожваннямі. І раптам мой позірк упаў на ланцужок у выглядзе залатой і сярэбранай пляскатай скамечаную цыдулку. Там было надрапана друкаванымі рускімі літарамі, што са мной хоча пазнаёміцца кальяншчык, якога завуць Арслан. «У перакладзе з турэцкай гэта азначае «леў», — дадаў ад сябе афіцыянт.

Арслан зусім не быў падобны на драпежнага звера, звычайны хударлявы цёмнавалосы мужчына з добразычлівай усмешкай. Арслан быў на дзіва сарамлівы, ён нават баяўся глядзець мне ў твар падчас нашай размовы і адводзіў позірк убок, як быццам яго вочы натыкаліся на асляпляльнае святло. Гэта было па-дзіцячы наіўна і міла. Але страла Амура і на гэты раз мяне абмінула.

Перад вячэрай я вырашыла пайсці на мора, балазе пляж знаходзіўся метраў за трыста ад гатэля. Мора ў нашым курортным пасёлку было зусім іншым, не такім сінім, як у бухце, куды заходзіў прагулачны катамаран з Кемера. У Бельдзібі яно было амаль што белым, вельмі салёным. Ад гэтага, як мне здаецца, яшчэ больш карысным і нават лячэбным. У такім «белым» моры было прыемна плаваць, шчыльная вада трымала цела на паверхні.

Менавіта тут, на прыбярэжнай паласе Міжземнага мора, дзе велізарная гара Тахталы, як адказны вартавы, упарта ўглядалася ўдалечынь, а сонца ўжо каціласа да захаду, я і сустрэла яго... Талай-хан — тутэйшы бог вады і акіяна — калыхаў нас на вялікіх пругкіх хвалях, як быццам падштурхоўваючы да знаёмства. Не памятаю, хто першым пачаў гутарку. Я — на грэбяні сённяшняй сваёй неверагоднай папулярнасці ў мужчын ці ён. Хутчэй за ўсё першымі загаварылі нашы вочы і вусны, бо мы адразу ўсміхнуліся адно аднаму. А потым ужо прамовілі словы прывітання.

Яго звалі Армаган — «асаблівы падарунак», калі па-турэцку. І сапраўды, па-мойму, бо мужчына быў падобны на маладога бога кахання Амура. Бездакорны профіль, цёмныя валасы, загарэлая скура. Ён быў амаль удвая маладзейшы, але праяўляў жывую цікаўнасць да мяне. Мы разам плавалі, нырялі, і часам нашы рукі сутыкаліся пад вадой. І тады яго пальцы цвёрда і настойліва сціскалі маю далонь, як быццам патрабавалі большай, сапраўднай жаночай ласкі. Але я не здавалася так лёгка. Быццам дураслівая котка, прымала сваю далонь і зноў плыла кудысьці ў глыбіню, каб там, нібыта ненаўмысна, зноў сустрэць яго рукі...

Так мы даволі доўга гарэзавалі, а потым, стаміўшыся, выйшлі на бераг. Ён нешта казаў па-турэцку, але я нічога не разумела. Адно мне было ясна: ён назначаў мне спатканне тут, на пляжы, сёння ўвечары.

Магчыма, шчыльнасць стрэлаў Амура зашкальвала ў той дзень, і таму здарылася неверагоднае: лежачы тут, на амаль пустым турэцкім пляжы, я неяк не заўважыла яе — пятую стралу Амура — і выпадкова прапусціла ў сваё сэрца.

Божа, навошта я гэта зрабіла! Я пайшла ў гатэль, а страла рэзала і назаляла. Я не магла забыцца, як мы разам плавалі, трымаючыся за рукі, як гарэлі яго вочы, якім прыгожым і шчырым быў яго смех. Мне здавалася, што я трапіла ў нейкае іншае вымярэнне... «У яго былі такія далікатныя і патрабавальныя пальцы, яго позірк быў такім ласкавым і хвалюючым, нязвыклы тэмбр яго голасу прыемна казытаў нутро».

Мы дамовіліся сустрэцца ў дзевяць гадзін вечара. Я хуценька пабегла ў гатэль, каб прыбрацца і павячэраць. Але трэба ж было такому здарыцца, што менавіта ў гэты дзень, тут, у Турцыі, я ўбачыла сваю добрую знаёмую, якая ішла мне насустрач! «Таша, як я рада цябе бачыць! Даўно адпачываеш? А я вось толькі з аэрапорта. Як добра, што цябе сустрэла, — тараторыла безупынку знаёмая. — А ў мяне сёння юбілей, ты памятаеш? Я хацела адсвяткаваць яго менавіта тут, у Бельдзібі».

Я нацягнута ўсміхалася, ківала галавой, нешта адказвала неўпапад, а сама ўсё яшчэ была на іншай хвалі, у іншым космасе. «Ды што з табою, сяброўка? Ты зусім мяне не слухаеш. Не закахалася часам?» — здзіўлена запытала юбілярка. Менавіта гэтае пытанне ацвераліла мяне. «Так, я закахалася, — падумала я, — але ж трэба неяк з гэтым спраўляцца. Проста трэба перажыць гэты дзень!..»

Потым мы святкавалі дзень нараджэння маёй прыяцелькі: курылі кальян, прыгатаваны ўсё тым жа закаханым у мяне Арсланам, пілі віно, танчылі, нас запрашалі ў свой круг Айкут, Адэм і Атмаджа, і зноў нешта пілі і елі... Я разумела, што ўсё скончана, што прайшло вельмі шмат часу. Што Армаган, напэўна, ужо даўно пайшоў і мне няма на што спадзявацца.

Позна вечарам вялікай гаманлівай кампаніяй мы пайшлі прагуляцца па набярэжнай, і раптам я заўважыла адзінокую мужчынскую постаць на пляжы, на тым самым месцы, дзе мы дамаўляліся сустрэцца. Гэта быў ён — Армаган, ён чакаў мяне ўвесь гэты час... Але ў мяне не хапіла смеласці падысці.

На наступны дзень я вярталася ў Беларусь. Самалёт прабег па ўзлётнай паласе, адарваўся ад зямлі і пачаў набіраць вышыню. І тады вяліія горы Усходні Таўр пачалі ўвачавідкі памяншацца ў памерах, пакуль не сталі маленькімі, пакатымі ўзгоркамі. А велічэзнае Міжземнае мора з вышыні палёту паветранага лайнера падалося невялікай блакітнай лужынай на бязмежнай прасторы Зямлі.

Мой першы адпачынак у Турцыі скончыўся. Усё было добра, але тая пятая страла Амура, якую я прапусціла ў сваё сэрца там, у Бельдзібі, назаляе мне да гэтага часу.

На ўласныя вочы

ЛАЗА ДАЎГАЛЕЦЦЯ

Вінаград перастае быць экзатычнай культурай для Беларусі

Днямі ў аграгарадок Самахвалавічы пад Мінскам з'ехаліся знакамітыя і пачынаючыя вінаградары з усіх рэгіёнаў Беларусі. На базе Інстытута пладаводства пагодлівым восеньскім днём адкрылася штогадовая выстава дасягненняў айчыннага вінаградарства — з важкімі вінаграднымі гронкамі, вырашчанымі на беларускай зямлі — як у цяпліцах, так і ў адкрытым грунце, уласнымі разынкамі і іншымі прысмакамі. А таксама з саджанцамі, якія прыцягнулі сюды многіх наведвальнікаў.

ДЗЕ СМАЧНЕЙШЫЯ ЯГАДЫ?

Культура гэтая перастае быць для нашых шырот экзотыкай, і паспрабаваць вырасціць уласны вінаград на сваіх сотках жадаюць многія. Асабліва — натхніўшыся прыкладам мэтраў. Тых, хто, як яны самі кажуць, улюбіўся ў гэтую культуру яшчэ тады, калі лічылася, што атрымліваць годныя ўраджаі з вінаграднікаў у нашай краіне амаль немагчыма. Гадоў 30 таму Беларусь называлі самай паўночнай краінай, дзе расце вінаградная лаза. Тады «мяжа» пралягала дакладна: праз Магілёў, Мінск, Гродна. На поўдзень ад гэтай умоўнай рысы вінаград яшчэ рос, хоць і патрабаваў неймаверных намаганняў для атрымання якога-ніякога ўраджаю. На поўнач — не, як ні старайся. У нашы дні вінаград вырошчваюць амаль да 60-й паралелі, то-бок пад Санкт-Пецярбургам, у Прыбалтыцы і Швецыі. Што да Беларусі, важкія гронкі ўжо выспяваюць ва ўсіх рэгіёнах. Не толькі дзякуючы пацяпленню клімату: сёння створаны сарты вінаграду з ультраранім тэрмінам паспявання, за кошт чаго змянілася мяжа распаўсюджвання культуры. І ўсё ж вінаград у нашых шыротах застаецца вельмі патрабавальнай і нават «інтэлектуальнай» культурай, адзначаюць і навукоўцы Інстытута пладаводства, і вінаградары-практыкі: каб атрымліваць высокія ўраджаі, трэба нястомна працаваць і ўвесь час вучыцца. А некалі каля вытокаў беларускага вінаградарства стаялі ўсяго чатыры чалавекі. Гэта доктар сельскагаспадарчых навук Рамуальд Эдуардавіч Лойка, у мінулым галоўны рэдактар часопіса «Ураджайныя соткі» Зінаіда Іосіфаўна Малашэвіч, найстарэйшы вінаградар краіны Віктар Паўлавіч Кухарэвіч і садоўнік-аматар Віктар Андрэевіч Пячко. Яны заснавалі пры Інстытуце пладаводства клуб «Паўночны вінаград», які за дзесяцігоддзі сваёй работы стварыў філіялы ва ўсіх абласцях нашай краіны, і менавіта на іх вопыце і навуковых працах вучыліся тыя, каго сёння па праве завуць масцітымі вінаградарамі Беларусі.

— Беларускі вінаград смачнейшы за той паўднёвы, які прадаецца ў гіпермаркетах і на рынках. Пераканайцеся самі! — кажа **Уладзімір УСЦІНАЎ, навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур РУП «Інстытут пладаводства» і кіраўнік клуба «Паўночны вінаград».** — Справа ў тым, што імпартны вінаград здымаюць у стадыі недаспеласці, ён даспявае ў дарозе. Да таго ж яго апрацоўваюць, каб не дапусціць гніення.

Вінаград на выставе — толькі што з вінаградніку, або, як тут кажуць, жывы. Знялі з расліны і, самае позняе, праз некалькі гадзін прапаноўваюць наведвальнікам: частуйцеся, спрабуйце! Тут жа можна купіць кілаграм ці два беларускага вінаграду дадому. Пакуль што такая магчымасць — рэдкасць.

— Прамысловыя вінаграднікі ў Беларусі яшчэ не развітыя, а прыватнікі ў асноўным вырошчваюць для сябе, сваёй сям'і. Лішкі рэалізоўваюць часцей на рэгіянальных рынках. Ці на выставах, — тлумачыць Уладзімір Мікалаевіч. — Ведаю, што беларускі вінаград можна купіць на рынку ў Оршы, ёсць магіляўчане, якія ў сезон прадаюць свой ураджай. Расцярэбіў вінаград пад Пінскам, Гомелем, Лідай, на Брэстчыне, вакол Мінска (Салігорск, Слуцк, Капыль).

Але да сталіцы, расказалі на выставе, беларускі вінаград «даязджае» рэдка. Што

Вінаградар Аляксандр КАРАСЬ прывёз на выставу ўраджай свайго сямейнага вінаградніку.

да цаны на айчынную «сонечную ягаду», ніжэйшай, чым на імпартны вінаград, яна быць не можа: фермерскі прадукт заўсёды даражэйшы за выраблены ў прамысловых маштабах. Затое прыватнік, выбіраючы сарты, арыентуецца ў першую чаргу не на лёжкасць, устойлівасць да хвароб і прадукцыйнасць, а выключна на смак. А, як вядома, адзін хоча сёе, другі — тое. Вось чаму на выставе пярэстая мазаіка з соцень сартоў і гібрыдаў вінаграду: ад буйнога (ягады памерам ці ледзь не са сліву) да дробнага віннага, ад белага, зялёнага, далікатна- і ярка-ружовага да вішнёвага, бардовага, фіялетавага і сіне-чорнага.

— Буйныя ягады — гэта цяпліца, закрыты грунт, — праводзіць «экскурсію» па сталах, дзе прадстаўлены ўраджай вінаградніку РУП «Інстытут пладаводства», Уладзімір Усцінаў. — А вось тут — сарты, вырашчаныя ў адкрытым грунце. У нас выспяваюць і сталовыя, і ўніверсальныя, і тэхнічныя сарты (для перапрацоўкі на віно). Тэхнічныя патрабуюць адкрытага грунту. Класіка вінаробства — старыя сарты, з якіх робяць класічныя віны (Кабернэ, Шарданэ, Рыслінг), — у нашых шыротах капрызныя, але мы працуем з міжвідавымі гібрыдамі класічных сартоў з больш зімаўстойлівымі, і — ёсць аддача.

У нашай краіне раяніравана 17 сартоў вінаграду — у тым ліку шэсць тэхнічных, расказаў вучоны. Сартоў вінаграду беларускай селекцыі пакуль не створана.

— Селекцыя вінаграду — працэс доўгатэрміновы і фінансава затратны, — тлумачыць Уладзімір Мікалаевіч. — Эканамічна больш мэтазгодна проста адабраць сарты, якія падыходзяць для нашых умоў, і працаваць з імі.

Дарэчы, гэтым летам, калі аграрыі скардзіліся на засуху, якраз для вінаграду склаліся вельмі спрыяльныя ўмовы, зазначае суразмоўнік.

— Дарослай лазе засуха ў нашых умовах не страшная: пры вырошчванні ў адкрытым грунце вады ёй дастаткова. У цяпліцы, натуральна, трэба паліваць. Спрыяльныя ўмовы для вінаграду складваюцца і цяпер. Верасень радуе які ўжо год. Калі тыдзень ці два прастаіць цёплае сонечнае надвор'е, вінаград набярэ цукар і стане яшчэ больш смачным.

— Можа быць, у сувязі са змяненнем клімату ёсць сэнс вырошчваць беларускі вінаград не толькі сіламі прыватнікаў, але і гаспадаркам?

— Калі будуць ахвотныя, калі гаспадаркі звернуць увагу на гэтую культуру, у Беларусі ёсць і раяніраваныя сорты, і агратэхніка, — кажа навуковец. — Так што ўсё залежыць выключна ад жадання людзей, якія працуюць на зямлі.

Суразмоўнік распавёў, што вінаград — культура, якая зацягвае: атрымаўшы ўраджай адзін раз, спыніцца ўжо немагчыма.

— Я з Віцебскай вобласці, палачанін. Будучы студэнтам першага курса Віцебскага ўніверсітэта, пазнаёміўся з Віктарам Паўлавічам Кухарэвічам, ён быў маім першым настаўнікам у вінаградарстве. Спачатку вырошчванне вінаграду было маім хобі, але ў 2002 годзе запрасілі ў Інстытут пладаводства працаваць з гэтай культурай. Так што вінаградам займаюся практычна ўсё жыццё.

«ГЭТА НЕ МЫ АБРАЛІ ВІНАГРАД, А ВІНАГРАД АБРАЎ НАС...»

Цікавы факт: у Інстытуце пладаводства ў Самахвалавічах, дзе ідзе селекцыя і сартавывучэнне па ўсіх пладовых культурах, сабрана калекцыя з 500 сартоў вінаграду, якія вырошчваюцца ў Беларусі. А на прысядзібных і дачных участках вінаградараў-практыкаў па ўсёй краіне расце ўжо 800 сартоў. Вінаградарства ў нашай краіне пакуль актыўна рухаюць наперад прыватнікі, працавітыя і неабыякавыя людзі, якім падабаецца добрасумленна працаваць і радавацца вынікам сваёй працы.

— Як я абраў гэтую культуру? Напэўна, выпадкова, — кажа адзін з найстарэйшых вінаградараў Беларусі Дзмітрый Ляшкевіч. — Купіў саджанец старога сорту, «Супагу» — вырасла лаза і дала ўраджай. Быў у Геленджыку, прывёз «Кадранку». І яна таксама дала ўраджай. Было гэта недзе гадоў 25 таму. Сёння ў мяне на ўчастку, у Смалявічах Мінскай вобласці — больш за 100 сартоў вінаграду і ў цяпліцах, і ў адкрытым грунце.

Гэтыя сакавітыя гронкі выраслі ў Мінскім раёне.

— Усё пачалося нават яшчэ раней, — парауляе мужа жонка Ларыса. — Спачатку мы проста купілі галінку вінограду, дзе быў кавалачак лазы. Гэты кавалачак уваткнулі ў зямлю і забылі пра яго — а вінаград пачаў расці. Я яго палола, ён то знікаў, то з'яўляўся некалькі сезонаў. Так што гэта доўгая гісторыя. Потым я перастала палоць лазу — падумала, хай расце. І ўжо пасля, заўважыўшы, што я зацікавілася вінаградам, муж купіў мне ў падарунак той самы саджанец сорту «Супага», аб якім ён расказваў. Так што гэта не мы выбралі вінаград, а вінаград абраў нас.

Для Дзмітрыя вінаграднік — хобі, працуе ён кіроўцам на птушкафабрыцы.

— Даводзіцца ўсё паспяваць: устаю рана, займаюся вінаградам перад працай, вяртаюся з работы і працягваю працаваць на вінаградніку.

Суразмоўнік кажа, што жонка Ларыса — яго першая памочніца.

— Працуе нараўне са мной, прымушае, калі залянуюся, — усміхаецца суразмоўца. Ён дадае, што, нягледзячы на пацяпленне клімату, ва ўласны вінаграднік даводзіцца ўкладваць вельмі шмат працы.

— Не скажу, што цяпер расціць вінаград у Беларусі прасцей, чым гадоў 20 таму. Сёлета ў красавіку былі маразы, і наш вінаграднік панёс вялікія страты нават у закрытым грунце.

Дзмітрый адзначае, што вінаград — культура, якая любіць у першую чаргу клопат і прадуманую агратэхніку. Ураджай у нашых шыротах — узнагарода за працу не толькі рук, але і розуму: трэба нястомнае паглыбленне ведаў.

— Мне падабаецца вяліць вінаград, — дзеліцца Ларыса. — Узімку ён ідзе і ў выпечку, і проста замест цукерак. Смачна і карысна.

Аляксандр Дубоўскі вырошчвае вінаград ужо гадоў 15.

— На самай справе гэтая культура даўно апрацоўваецца ў Беларусі. Яшчэ ў савецкія гады пад Пінскам вялася яго айчынная селекцыя. Так што нельга сказаць, што ён для нас чужы. Проста раней ён не быў распаўсюджаны. А цяпер расце па ўсёй краіне. Людзям гэта цікава, яны жадаюць навучыцца правільна даглядаць яго.

Суразмоўнік распавядае, што вырошчвае каля 150 сартоў і гібрыдных формаў вінаграду з костачкамі і без. І дадае, што якраз костачка — самае карыснае.

— Менавіта ў вінаградных костачках утрымліваюцца ўсе карысныя рэчывы, а сама мякаць — гэта ў першую чаргу глюкоза, — падкрэслівае ён.

Дарэчы, з вінаграду можна рабіць не толькі разынкі (або віно). З «сонечнай ягады» атрымліваецца вельмі смачная пасціла. Яшчэ адзін цікавы від нарыхтовак — мочаны вінаград. У розных падліўках смак вінаграду раскрываецца па-рознаму, запэўніваюць вінаградары.

Аляксандр кажа, што сёння цікавасць да ягады — не толькі ў прыватнікаў.

— Ужо спрабуюць вырошчваць гэтую культуру ў прамысловых пасадках. Камбінат «Усход» пад Гомелем заклаў каля сямі гектараў вінаграду пяць гадоў таму, Пінскі вінаробны завод таксама вырошчвае вінаград. І тут, у Самахвалавічах, ёсць вінаграднік з вялізнай калекцыяй сартоў.

Вінаградарства ў нашай краіне будзе развівацца, перакананы ён.

ЖАНОЧАЯ СПРАВА

Ураджай вінаграду забяспечваецца штодзённай цяжкай працай нават у краінах з аптымальным для яго кліматам. Таму прынята лічыць, што не жаночая гэта справа. Але мужчын і жанчын на выставе — практычна пароўну. Людміла Юзафатава — адзін з найстарэйшых вінаградараў Беларусі. Вінаградам займаецца з 1995 года, на яе зямельным участку (ён размешчаны недалёка ад МКАД) колькасць сартоў вылічаецца не дзясяткамі, а... сотнямі.

— Спраўляюся, — усміхаецца Людміла Васілеўна. — Але хачу скарачаць сартавую разнастайнасць: нарэшце выбрала тыя сарты, якія мяне цалкам задавальняюць.

Алена Лэкэтуш прывезла на выставу свой ураджай з Оршы. Вінаград яна расціць крыху меншы тэрмін, чым Людміла Юзафатава, але ўсё роўна вопыт вялікі — 23 гады. Алена працуе фельчарам і, як і належыць медыку, да любой справы падыходзіць грунтоўна: у тым ліку да выбару хобі. Спачатку доўга прыглядалася, чытала навуковыя артыкулы, ездзіла на профільныя выставы, дзе збіраюцца вінаградары. А калі на яе ўчастку з'явіліся першыя саджанцы, паводле яе слоў, літаральна «захварэла» на гэты занятак.

— Да кожнага куста патрэбен індывідуальны падыход, нават калі гаворка ідзе аб дзесяці раслінах аднаго і таго ж сорту, — тлумачыць суразмоўніца.

Яна расказвае, што гэта неверагодна патрабавальная культура, якой патрэбны пастаянны догляд і ўвага: «Увесь сезон ад вінаградніку літаральна не адыходзіш».

— Затое ўраджай дорыць здароўе і даўгалецце. І так прыемна частаваць сакавітымі гронкамі і сваіх дамашніх, і сяброў, і проста добрых людзей!

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (продавец) извещает о проведении 25 сентября 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 80 % по продаже имущества на праве хозяйственного ведения в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи без учета НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка без учета НДС (20 %), бел. руб.
1	**Изолированное помещение с инв. № 311/D-8557,** общей площадью **50,1 кв. м**, назначение – помещение связи, назначение – помещение отделения почтовой связи. Адрес: Гомельская обл., Добрушский р-н, Жгунский с/с д. Жгуно-Буда, ул. Школьная, 5-1. **Информация о земельном участке:** расположено на земельном участке с кадастровым номером **321282003101000209** общей площадью **0,1645 га (право аренды). Доля в праве 1/2**. **Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Добрушский р-н, с/с д. Жгуно-Буда, ул. Школьная, 5. **Целевое назначение земельного участка:** для строительства и обслуживания жилого дома	**1 019,23**	203,85

Продавец: Гомельский филиал РУП «Белпочта», 246048, г. Гомель, ул. Советская, 8.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) осуществляется по контактному тел. **8 (029) 733-56-73;** заключение договора **8 (029) 607-08-25. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»):** р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 12 сентября 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Формы заявления и соглашения можно предварительно запросить у Организатора аукциона по электронной почте expert-usluga.by@mail.ru.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 21 сентября 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. Победитель аукциона либо единственный участник, согласный приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на **5** % (далее – Претендент на покупку), обязан: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня проведения аукциона (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего возмещение Организатору аукциона стоимости затрат на организацию и проведение аукциона), оплатить стоимость приобретенного имущества в течение **30 (тридцати) календарных дней** с даты заключения договора купли-продажи, за исключением оплаты стоимости приобретенного имущества в рассрочку. Рассрочка оплаты стоимости приобретенного имущества предоставляется по письменному заявлению Победителя аукциона (Претендента на покупку) в соответствии с законодательством. Имущество, проданное с рассрочкой оплаты, находится в залоге у Продавца для обеспечения исполненной Покупателем обязанности по оплате его цены в соответствии с заключенным договором купли-продажи. Передача имущества Покупателю будет осуществляться после полной оплаты цены продажи объекта.

Порядок проведения аукциона определен Положением «О порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609 «Об утверждении Положения о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности».

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 20.06.2023 г. № 116 (29996).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Мозырский ДОК» (продавец) извещает о проведении 25 сентября 2023 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 80 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи для лота № 1: Победитель аукционных торгов дополнительно возмещает расходы по предпродажной подготовке: по определению рыночной стоимости в сумме: **324,00** бел. руб. **Условие продажи для лота № 2:** Победитель аукционных торгов дополнительно возмещает расходы по предпродажной подготовке: по определению рыночной стоимости в сумме: **14 867,29** бел. руб.			
1	**Капитальное строение с инв. № 331/С-45500** общей площадью **241,3 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **контора**. Адрес: Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. 9 Мая, 58. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321450100004001278** общей площадью **0,2072 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. 9 Мая, 58. **Целевое назначение земельного участка:** для размещения объектов административного назначения	**9 672,00**	967,20
2	**ПОЛНЫЙ И ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА в кол-ве 22 объектов недвижимости размещен на сайте Организатора торгов www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». В состав лота входит:** трансформаторная подстанция КТП-74, тип КТП-250-10-81 У1 (зав. № 287834), 1984 г. в., трансформатор силовой ТМ-250/10-66У1 (зав. № 712933), 1978 г. в. **Адрес:** Гомельская обл., Ельский р-н, г. Ельск, ул. Рабочая, 1Б	**232 032,00**	23 203,20

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи **– 8 (0236) 37-54-46 – Екатерина Геннадьевна.**

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (ОАО «Мозырский ДОК»):** р/с BY72 AKBB 3012 0142 7309 3330 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 317, УНП 490617960, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__. Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 12 сентября 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Формы заявления и соглашения можно предварительно запросить у Организатора аукциона по электронной почте expert-usluga.by@mail.ru.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 21 сентября 2023 г. в 16.00 включительно.** Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; для лота № 1 заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты для лота № 1: 50 % цены продажи объекта в течение 10 (десяти) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи; остальные 50 % цены продажи объекта в течение 30 (тридцати) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи. Для лота № 2 заключить договор купли-продажи в течение **60 (шестидесяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты для лота № 2: 50 % цены продажи объекта в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи; 50 % цены продажи объекта в течение 30 (тридцати) рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи.

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 08.12.2022 г. № 241 (29863); от 20.04.2023 г. № 75 (29955).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Контактные данные: 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества унитарного предприятия «Метиз»

Аукцион состоится **06.10.2023 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Лот № 1

Капитальное строение с инв. № 700/С-12836 – Дом культуры, пл. 3569,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 27А.

Капитальное строение с инв. № 700/С-115718 – наружный водопровод к зданию Дома культуры по ул. Космонавтов, 27А в границах ВК1-ВК2 – здание Дома культуры, протяженность: 130,7 кв. м.

Капитальное строение с инв. № 700/С-115716 – сети канализации, протяженность: 49,7 кв. м.

Капитальное строение с инв. № 700/С-115717 – теплотрасса, протяженность: 28,2 кв. м.

Сведения о земельном участке: лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 740100000003002331 (пл. 0,3511 га, право постоянного пользования).

Начальная цена продажи: 1 091 437,20 бел. руб. с учетом НДС.

Сумма задатка: 109 143,72 бел. руб.

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа 40901. Срок подачи документов для участия в аукционе: **по 05.10.2023 до 11.00.** Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона **ino.by.** Доп. информацию можно получить **по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому городскому филиалу Гродненского областного потребительского общества

Аукцион состоится 25.09.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

